КАЛЁНКА РЭДАКТАРА

Вера ў перамены

Першыя два месяцы лета аказаліся багатыя на падзеі. Галадоўка апазыцыйных палітыкаў з патрабаваньнямі зьменаў у Выбарчы кодэкс была спробай перахапіць ва ўлады ініцыятыву. І калі б галадоўшчыкі атрымалі большую грамадзкую падтрымку, відавочную, а не маўклівую, дык і вынікі акцыі маглі б быць іншымі. Але рэжым не ідзе ні на якія саступкі ў справе выбарчага заканадаўства - страх страціць уладу пераважае здаровы сэнс. Таму ягоныя спробы наладзіць татальны кантроль над грамадзтвам будуць працягвацца.

Галоўнай апазыцыйнай акцыяй лета мусіла стаць адзначэньне 10-х угодкаў прэзыдэнцтва А. Лукашэнкі. Але наіўна было спадзявацца на цуд, таму і ня было 21 ліпеня на вуліцах Менску дзясяткаў тысяч дэманстрантаў. Апатыя людзей і нявер'е ў здольнасьць апазыцыі зьмяніць сытуацыю ў краіне рэгулярна і актыўна падтрымліваюцца, умацоўваюцца афіцыйнай прапагандай. Зусім невыпадкова напярэдадні адбылася чатырохгадзінная прэс-канфэрэнцыя Лукашэнкі, якая была поўная абразаў і пагрозаў у бок дэмакратычных сілаў і іх лідэраў. Але яе галоўнай задачай было ўмацаваньне якраз "агульнай млявасьці і абыякавасьці да жыцьця" нашых грамадзянаў. Заявы пра рэфэрэндум, "падтрымку народу", трэці тэрмін прэзыдэнцтва і "прыгожую перамогу" гучалі, як нямінучая пэрспэктыва, якой хочуць "ашчасьлівіць" беларускі народ. У такой сытуацыі беларускім дэмакратычным палітыкам і грамадзкім дзеячам нічога не застаецца, як апэляваць да народу, ісьці да людзей, даносячы да іх сваю праграму, умацоўваючы іх веру ў магчымасьць зьменаў да лепшага.

Тэмай гэтага нумару «Асамблеі» зьяўляюцца формы ўдзелу грамадзкіх аб'яднаньняў у парлямэнцкай выбарчай кампаніі. Ад таго, як сёлета папрацуюць грамадзкія актывісты, у немалой ступені будзе залежыць посьпех на выбарах дэмакратычных сілаў. А яны, як ніколі, нацэленыя на барацьбу і перамогу.

Зьмест

КАЛЁНКА РЭДАКТАРА 1

АСАМБЛЕЯ
Плённы старт новай Рабочай групы 2, 24

ТЭМА
Формула перамогі 3
Віктар Пашкевіч

Нас з вамі большасьць 4
Вацлаў Арэшка

Пасярэдніцкая місія 5
Апытаньне беларускіх палітолягаў

Супольная праца дзеля пазытыўнага выніку 6
Апытаньне беларускіх грамадзкіх дзяячоў і палітыкаў

"Партнэрства" хоча наглядаць аб'ектыўна 7

Не дэпалітызаваныя, але дэпартызаваныя 7

Барысаўская стратэгія 8
Вінцэсь Дземянчук

Пятрас Грэбляўскас: "Партыі зацікаўленыя ў нашай падтрымцы" ... 9
Інтэрвію з лідэрам літоўскай "Салідарнасьці"

Палата прадстаўнікоў – за справядлівыя выбары 10

6 РЭГІЁНАЎ 12

ДАЙДЖЭСТ
Сацыяльная адказнасьць бізнэсу 14

ПЕРАМОЖЦЫ МЕСЯЦА 15

ПАДЗЕІ 16

ГУТАРКА
Парфяновіч адбіў атаку чыноўнікаў і генэралаў 20
Вольга Мікалайчык

ПАЗЫЦЫЯ
Эфэкт Франкенштэйна 21

АСАМБЛЕЯ
"Мы павінны стварыць умовы для разьвіцьця арганізацыйнай культуры" 27
Ірына Жыхар

Жывая мова нашага сэктару: "GONGO, MONGO... BINGO!" 28
Юры Чавусаў

ІНІЦЫЯТЫВА
Аматары "жывой гісторыі" 30
Вінцэсь Дземянчук

КАНСУЛЬТАЦЫЯ
Ухваленьне і рэгістрацыя праектаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі 32
Вольга Смалянка

BIBLIO
Складана пра важнае 36
Людвік Бэра

Плённы старт новай Рабочай групы

Фота Алёны Андрэевай

19-20 чэрвеня ў Менску адбылося другое пасяджэньне новай Рабочай групы, абранай на V Кангрэсе Асамблеі (першае прайшло адразу пасьля Кангрэсу, 2 траўня, і на ім было абранае кіраўніцтва Асамблеі). На пасяджэньні прысутнічалі 39 чалавек (усяго ў Рабочую групу ўваходзіць 41 прадстаўнік НДА). Сябры Рабочай групы, якія абіраюцца ў яе ўжо ня першы раз, назвалі яго найбольш выніковым за ўсю гісторыю існаваньня Асамблеі.

1-2 траўня падчас Кангрэсу Асамблеі быў прэзэнтаваны і зацьверджаны Стратэгічны плян разьвіцьця Асамблеі на бліжэйшыя 5 гадоў. Таму галоўнай мэтай першага пасяджэньня Рабочай групы стала абмеркаваньне і зацьвярджэньне Рабочага пляну стратэгічных напрамкаў дзейнасьці на бліжэйшы год.

Найперш сябры Рабочай групы зьвярнуліся да разгляду рабочых плянаў, скіраваных на рэалізацыю мерапрыемстваў у напрамку стратэгічнага пляну: **"Прасоўваньне інтарэсаў шляхам салідарных дзеяньняў"**.

Падчас пасяджэньня былі прэзэнтаваныя і зацьверджаныя канцэпцыя ***"Стратэгіі салідарных дзеяньняў беларускіх НДА"*** і рабочы плян яе рэалізацыі. Сярод запланаванага ў межах выкананьня стратэгіі:

- ажыцьцяўленьне пэрманэнтнага маніторынгу выкананьня права на асацыяцыю ў Беларусі (праз звароты ў дзяржаўныя органы і тэлефонныя апытаньні) і агучваньне яго вынікаў праз выданьне брашуры;

- параўнальны аналіз заканадаўства Беларусі ў галіне свабоды асацыяцыяў з заканадаўствам замежных краінаў і міжнароднымі стандартамі права на асацыяцыю з распрацоўкай адзінага сьпісу патрабаваньняў адносна зьменаў у беларускім заканадаўстве і правапрымяняльнай практыцы з выданьнем дзьвюх брашураў;

- прававыя і грамадзкія дзеяньні па прасоўваньні прапанаваных зьменаў у заканадаўства і правапрымяняльную практыку ў галіне свабоды асацыяцыяў на падставе зробленага маніторынгу і прававога аналізу.

Алена Танкачова, старшыня забароненага "Таварыства прававых дасьледаваньняў, якая прэзэнтавала "Стратэгію салідарных дзеяньняў", гаворыць, што галоўнай мэтай стратэгіі зьяўляецца "стварэньне ўмоваў для дасягненьня свабоднай рэалізацыі права на аб'яднаньне ў Беларусі праз супольныя, салідарныя і скаардынаваныя дзеяньні беларускіх няўрадавых арганізацыяў (прававыя, асьветніцкія і грамадзкія дзеяньні)".

Былі разгледжаныя дзьве схемы ***грамадзкага прызнаньня беларускіх НДА***. Нагадаем, што на Кангрэсе абдылося пасяджэньне сэкцыі "Праца ў новых умовах: альтэрнатыўнае прызнаньне", вынікам якога сталі распрацаваныя рэкамэндацыі для новай Рабочай групы. Рабочай групе даручылі распрацаваць і зацьвердзіць мэханізм легалізацыі альбо грамадзкага прызнаньня грамадзянскіх ініцыятываў (няўрадавых арганізацыяў). У якасьці прыярытэтнай сябрамі РГ была вызначаная схема прызнаньня, якая ўтрымлівала Асамблею як ключавы орган. Гэтая схема была адпраўленая на дапрацоўку да наступнага пасяджэньня РГ.

"Асноўны сэнс схемы ў тым, што мусіць быць створана Міжнародная асацыяцыя, сярод заснавальнікаў якой будуць і беларускія грамадзкія дзеячы, і замежныя. Мяркуецца, што сярод замежных заснавальнікаў будуць вядомыя і аўтарытэтныя асобы з Польшчы, Літвы, Чэхіі, - распавядае намесьнік старшыні Рабочай групы Асамблеі НДА **Барыс Звоскаў**. - Гэтая асацыяцыя пачне рэалізацыю пэўнай праграмы, якую пасьля будзе весьці Рабочая група: разглядаць і затым рэкамэндаваць кандыдатаў на ўступленьне ў асацыяцыю (арганізацыі, ініцыятывы, групы і г. д.). Новыя сябры

(працяг на ст. 24)

Формула перамогі

Беларускія дэмакратычныя палітыкі даўно ня ведаюць смаку перамогі. Вядома, былі пасьпяховыя акцыі, перамогі маральныя альбо мясцовыя, але рэальных выйгрышаў у нацыянальным маштабе за апошняе дзесяцігодзьдзе на іх рахунку няма. З такім багажом ім даводзіцца ўступаць у новую буйную палітычную кампанію - выбары ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. Ад таго, ці вынайдуць дэмакратычныя сілы ў бліжэйшы час "формулу перамогі", залежыць будучыня Беларусі, выбар шляху, па якім наша краіна будзе крочыць у бліжэйшыя гады.

Віктар Пашкевіч

Фота Глеба Лабадзенкі

Стабільныя паразы і няўдачы выпрацоўваюць у палітыкаў нявер'е ў свае сілы, апатыю і нежаданьне зноў і зноў кідацца ў вір палітычнай барацьбы. Гэтаму спрыяюць і рэпрэсіі рэжыму, накіраваныя на актывістаў, і прымітыўная прапаганда, якая бэсьціць і палівае брудам ні ў чым не вінаватых людзей. Перад лідэрамі дэмакратычнага руху сёньня стаіць складаная задача ня толькі аб'яднаньня ўсіх наяўных сілаў і рэсурсаў, але і перакананьня людзей у існаваньні рэальнага пераможнага сцэнару.

У пошуку "формулы перамогі" выключную ролю можа адыграць трэці сэктар. Ён не абцяжараны паразамі палітыкаў, не апанаваны апатыяй, а варушыцца, пасьпяхова працуе ва ўмовах рэпрэсіяў, інтэгруе новыя ідэі, складае стратэгічныя пляны. А галоўнае - некаторыя грамадзкія актывісты актыўна працуюць зь людзьмі, дапамагаюць ім у вырашэньні надзённых праблемаў, заваёўваюць аўтарытэт і давер у сваіх гарадах і мястэчках. І, адпаведна, маюць добрыя шансы быць падтрыманымі выбарцамі ў выпадку балятаваньня ў якасьці кандыдатаў у дэпутаты.

Падчас сёлетняга Кангрэсу Асамблеі НДА Беларусі абмяркоўваліся магчымыя формы ўдзелу трэцяга сэктару ў выбарчай кампаніі. Відавочна, што толькі адзінкавыя грамадзкія арганізацыі легальна возьмуць у ёй удзел, большасьць іх сябраў будуць працаваць як фізычныя асобы. Формы ж удзелу будуць самыя розныя: мабілізацыйныя і сацыяльныя кампаніі, назіраньне і маніторынг, адукацыйная і інфармацыйная праца, юрыдычная дапамога ды інш. Менавіта трэці сэктар мусіць умацаваць і ажывіць выбарчыя кампаніі дэмакратычных кандыдатаў.

Сёньня, гаворачы пра формы ўдзелу грамадзкіх аб'яднаньняў у выбарчай кампаніі, мы ня часта згадваем пра рызыку, на якую яны ідуць. "Зачыстка" трэцяга сэктару праводзілася ўладамі з мэтай яго аслабленьня, а значыць - зьмяншэньня падтрымкі апазыцыйных палітыкаў на выбарах. Ужо цяпер можна прагназаваць новы наступ уладаў на грамадзкія аб'яднаньні ў пасьлявыбарчы пэрыяд - гэта будзе своеасаблівая помста за неляяльнасьць і падрыхтоўка да новых выбараў - прэзыдэнцкіх. У такіх умовах трэці сэктар ня мае права на памылкі, мусіць працаваць зладжана і прафэсійна, не даючы ўладам падставаў для новай хвалі рэпрэсіяў.

Аднак усё карэнным чынам можа зьмяніць магчымы рэфэрэндум, неабходны Лукашэнку для "легалізацыі" свайго ўдзелу ў наступных прэзыдэнцкіх выбарах. Пагроза яго правядзеньня будзе існаваць да пачатку верасьня, калі яшчэ заканадаўства дазваляе сумяшчэньне гэтай палітычнай акцыі з выбарамі ў Палату прадстаўнікоў. І калі рэфэрэндум стане рэальнасьцю, грамадзкія актывісты павінны ўключыцца ў актыўнае процідзеяньне спробе сп. А. Лукашэнкі атрымаць дазвол балятаваньня на трэці прэзыдэнцкі тэрмін.

Кастрычніцкія выбары могуць стацца першым крокам дэмакратычных сілаў да перамогі над аўтарытарным рэжымам. Дзеля яе мала вынайсьці пераможны сцэнар, бо ён яшчэ мусіць быць пасьпяхова рэалізаваны агульнымі высілкамі ўсіх тых, хто прагне пераменаў і хто ўжо зрабіў свой выбар.

Нас з вамі большасьць

Трэба працаваць - амаль аднагалосна вырашылі ўдзельнікі Кангрэсу НДА Беларусі, калі абмяркоўвалі пытаньне ўдзелу альбо няўдзелу трэцяга сэктару і яго сябраў у сёлетняй выбарчай кампаніі. Гэтае аднадумства нават зьдзівіла: пасьля расчараваньняў 2001 году чакаліся жорсткія спрэчкі, бо шмат хто, у сваім часе, казаў: "Ніколі болей!"

Рэжым ізаляваўся ад грамадзтва, бо разумее, што ўжо ня мае ягонай падтрымкі
Фота Глеба Лабадзенкі

Як бы ні наракалі мы часам на адарванасьць трэцяга сэктару ад грамадзтва, НДА адлюстроўваюць (інакш і ня можа быць) тыя працэсы, якія адбываюцца ў грамадзтве. Яно ўжо сасьпела да пераменаў. І НДА, магчыма, не зусім усьведамляючы гэта, адказалі на выклік часу. З самога факту прыняцьця такога рашэньня Кангрэсам вынікае, на маю думку, і асноўны напрамак дзейнасьці дэмакратычнага трэцяга сэктару падчас палітычнай кампаніі.

Гэта не назіраньне на выбарах і не навучаньне актывістаў, не збор подпісаў і не мабілізацыйныя акцыі (вядома, усё гэта было і застаецца важнымі й вельмі патрэбнымі справамі).

Пра гэты напрамак амаль не разважалі на Кангрэсе і не ўпісалі яго ў рэкамэндацыі сэкцыі, якая абмяркоўвала пытаньні ўдзелу НДА ў выбарчай кампаніі. Што ж гэта за напрамак?

Назавем яго так: НАС З ВАМІ БОЛЬШАСЬЦЬ.

Сацыёлягі і палітычныя лідэры ўпарта паўтараюць: "Падтрымка рэжыму за апошнія гады ўпала "ніжэй за калена", людзей, гатовых падтрымаць перамены ў Беларусі, прагаласаваць за дэмакратычных кандыдатаў, - усё болей. Кожны, хто сочыць за палітычным далягляда м, можа і без усялякіх аналітыкаў прыйсьці да высновы, што ніколі яшчэ рэжым ня быў так непажаданы ў сьвеце і так безнадзейны ў сваёй краіне, як цяпер.

Але ледзьве ці ня ў кожнай "пабытовай" размове на палітычную тэму можна пачуць: "Усё роўна нічога ня зьменіцца, усё роўна як захочуць, так і зробяць, усё роўна ён прасядзіць яшчэ дваццаць год..." І гэтак далей, і да таго падобнае. Нават многія грамадзкія і палітычныя актывісты гавораць тое самае, але ўсё ж пачынаюць нешта рабіць. Бо яны - актывісты, і "вецер пераменаў" бударажыць іх.

Шмат хто ў Беларусі думае: "Так, я незадаволены тым, як я жыву, я ўсё больш хачу, каб нешта зьмянілася ў краіне... Але ж астатнім усё роўна. Альбо ўвогуле падабаецца... Нічога мне не зрабіць. Лепш сядзець ціха і прыстасоўвацца". Сёньня такіх - і пра гэта таксама гавораць сацыёлягі - ледзь ня большая частка нашага грамадзтва.

Такім чынам, праблема ў тым, што, нягледзячы на агульныя зьмены ў грамадзтве, асобныя яго адзінкі - грамадзяне - яшчэ не ўсьведамляюць, што сытуацыя ўжо іншая, што адбыліся незваротныя зьмены ў палітычным раскладзе, у эканоміцы, у грамадзкай сьвядомасьці. Галоўнае - яны не ўсьведамляюць таго, што так, як яны, думаюць многія. Яны папросту ня вераць, што яны - большасьць. А ў большасьці, зразумела, нашмат больш і магчымасьцяў - у параўнаньні з адзінкамі. І калі людзі з нармальнымі поглядамі канчаткова зразумеюць, што іх шмат, што яны сапраўды большасьць, Беларусь будзе іншаю.

Дапамагчы грамадзтву паверыць у сябе, у свае сілы і магчымасьці - што як ня гэта можа быць найшляхетнейшаю і найадпаведнейшаю задачаю для грамадзкіх арганізацыяў? Справа палітыкаў - пераконваць, што Лукашэнка такісякі, што менавіта яны - лепшыя і патрэбныя. Іхная справа - змагацца за месцы ў парлямэнце ці за пасаду прэзыдэнта. І мы - трэці сэктар - павінны іх падтрымаць і дапамагчы, і, як вырашылі на Кангрэсе, будзем гэта рабіць. І калі мы дапаможам зьмяніць стаўленьне грамадзтва да самога сябе - у палітыкаў зьявіцца рэальная магчымасьць давесьці сваю справу да ладу.

Якім чынам гэта можна рабіць? На маю думку, ня трэба нічога асаблівага. Проста трэба рабіць сваю справу. Рыхтаваць назіральнікаў, вучыць валанцёраў, вылучацца ў камісіі, зьбіраць подпісы... А таксама рабіць усё то, што мы рабілі заўсёды, - кожны можа дадаць не адзін пункт. А галоўнае - грукацца ў дзьверы, размаўляць зь людзьмі, быць зь імі разам. Калі мы будзем заўважныя, калі мы будзем моцныя і ўпэўненыя, людзі навокал таксама стануць моцнымі і ўпэўненымі. Яны адчуюць і паверацъ, што

НАС З ВАМІ БОЛЬШАСЬЦЬ. І МЫ ПЕРАМОЖАМ.

Вацлаў Арэшка

Пасярэдніцкая місія

Апытаньне беларускіх палітолягаў

Формы ўдзелу НДА ў будучай кампаніі выбараў у палату прадстаўнікоў могуць быць самымі разнастайнымі. Свае погляды на гэта маюць і грамадзкія актывісты, і палітыкі. Мы ж пацікавіліся меркаваньнямі на гэты конт беларускіх палітолягаў, якія адказвалі на пытаньне: "Якія, на ваш погляд, магчымыя формы ўдзелу арганізацыяў трэцяга сэктару ў парлямэнцкай кампаніі?"

Ірына Бугрова, палітоляг, кансультант праграмаў ЭГУ, экспэрт ГА "Эканамічная адукацыя і эканамічныя дасьледаваньні":

— Пачнём з таго, што, згодна з артыкулам 45 Выбарчага кодэксу, грамадзянам, палітычным партыям ды грамадзкім аб'яднаньням даецца права правядзеньня агітацыі за кандыдатаў ды іх праграмы. З гэтага вынікае, што любое грамадзкае аб'яднаньне мае права вызначыць для сябе адпаведнага кандыдата ды падтрымліваць яго ўсімі мажлівымі формамі, якія не пярэчаць дзейнаму заканадаўству. Гэта па-першае. Падругое, любая кампанія не павінна стацца вакуумнай для грамадзкіх аб'яднаньняў, не павінна прайсьці міма іх, бо гэта дае магчымасьць зрабіць больш трывалай сувязь з выбарнікамі. Гэта таксама і мабілізацыя грамадзянскай актыўнасьці, прыцягненьне грамадзянаў да кампаніі, а значыць — да размовы аб праблемах, якія іх турбуюць, ды спосабах іх вырашэньня. Грамадзкія аб'яднаньні — гэта актыўныя групы, і яны могуць мабілізаваць грамадзянаў для прыняцьця рашэньняў. А паколькі нашыя кампаніі пакуль што даволі супярэчлівыя, як з тэхнічнага боку, так і з боку ўдзелу ў іх розных палітычных сілаў, дык з гэтага можа вынікаць пасярэдніцкая місія, якую можа ажыцьцявіць трэці сэктар, умоўна кажучы, паміж выбарнікам і выбарчым участкам, то бок палітычная адукацыя. І, па-трэцяе, гэта можа быць форма своеасаблівай дамовы кандыдата з выбарнікамі. Бо грамадзкія аб'яднаньні, як ніхто іншы, ведаюць прыватныя пытаньні, інтарэсы групы, канкрэтныя праблемы. Калі, напрыклад, грамадзкае аб'яднаньне выступае ініцыятарам збору подпісаў пад патрабаваньнямі, якія выстаўляюцца кандыдату, — гэта своеасаблівы наказ выбарнікаў кандыдату. А потым важна сачыць за тым, як гэты наказ выконваецца, спытаць з дэпутата за выкананьне дамовы паміж грамадзтвам і палітыкам. А любы дэпутат, я перакананая, павінен быць палітыкам. Гэта такі элемэнт лобінгу інтарэсаў групы.

Сьвятлана Навумава, палітоляг, загадчыца катэдры сацыяльна-палітычных навук Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту:

— Найперш НДА будуць удзельнічаць у якасьці валанцёраў, бо кампанія шмат у чым будзе арганізаваная менавіта трэцім сэктарам (я маю на ўвазе арганізацыйны складнік). На іх кладзецца найвялікшая праца, як гэта заўсёды і бывае. Крайнім таксама, хутчэй за ўсё, апынецца менавіта трэці сэктар. Хачу зазначыць, што ў арганізацыях гэтымі справамі будуць займацца людзі маладыя і, на жаль, неабучаныя. А гэта цяжкая і складаная праца, якая патрабуе спэцыяльнай падрыхтоўкі. Некаторыя людзі — сябры НДА будуць вылучацца ў якасьці кандыдатаў. Такія людзі ўжо ёсьць, і іх будзе яшчэ больш. Трэці сэктар, відаць, можа быць задзейнічаны і ў іншых важных элемэнтах выбарчай кампаніі.

Валер Карбалевіч, палітоляг, аналітычны цэнтар "Стратэгія":

— Вылучаць кандыдатаў арганізацыям трэцяга сэктару забаронена Выбарчым кодэксам. Таму ў першую чаргу сябры арганізацыяў трэцяга сэктару будуць, на маю думку, намагацца ўвайсьці ў склад выбарчых камісіяў, а таксама — прыняць удзел у якасьці назіральнікаў. Ну і, зразумела, добраахвотная праца на кандыдатаў, на каманды кандыдатаў, але ў якасьці не арганізацый як такіх, а як асобных яе сяброў.

Фота Глеба Лабадзенкі

Андрэй Фёдараў, незалежны палітоляг-міжнароднік:

— Я выказваю меркаваньне з пазыцыі шараговага грамадзяніна. У першую чаргу, гаворка тут можа йсьці пра тыя НДА, якія ўвогуле сутыкаюцца з палітыкай, — наўрад ці пра кінолягаў ці філятэлістаў... Перадусім можна казаць пра інфармацыйнае забесьпячэньне кампаніі. З аднаго боку — кандыдатаў у дэпутаты. Напрыклад, сацыялягічныя лябараторыі, напэўна, будуць гэтым займацца падчас выбарчай кампаніі. Ці, наадварот, некаторыя НДА могуць інфармаваць насельніцтва пра тых ці іншых кандыдатаў. Але на практыцы такія рэчы ў нас цяжкавата рэалізаваць, у зьвязку зь неразьвітасьцю грамадзянскай супольнасьці ўвогуле ды паліталягічных дасьледаваньняў у прыватнасьці.

Аляксандар Фядута, старшыня рады ГА "Сацыяльныя тэхналёгіі":

— З майго пункту погляду, галоўнае — гэта кантроль. Гэта значыць, што грамадзянская супольнасьць павінна быць зацікаўленая ў тым, каб выбары праходзілі сумленна. Думаю, што гэта — адзінае, у чым павінна быць зацікаўленая грамадзянская супольнасьць, то бок арганізацыі трэцяга сэктару. Падлік галасоў павінен быць абсалютна зразумелы і празрысты. Таму арганізыцыі трэцяга сэктару павінны паклапаціцца пра тое, каб трапіць у лік назіральнікаў і ў выбарчыя камісіі.

Запісаў Зьміцер Дрыгайла

Супольная праца дзеля пазытыўнага выніку

Раз'яднанасьць дэмакратычных сілаў Беларусі ўжо неаднойчы прыводзіла да іх паразаў на выбарах. Таму аб'яднаньне дзеяздольных палітычных і грамадзкіх структураў сёньня зноўку становіцца актуальнай і важнай справай. Мы правялі апытаньне палітыкаў і грамадзкіх дзеячоў на тэму: "Якія, на ваш погляд, магчымыя формы ўзаемадзеяньня суб'ектаў палітыкі і арганізацыяў трэцяга сэктару ў маючай адбыцца парлямэнцкай кампаніі?"

Фота Андрэя Лянкевіча

Уладзімер Навасяд, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу другога скліканьня:

- Трэба зыходзіць з Выбарчага кодэксу, які падае сьпіс тых, хто можа вылучаць кандыдатаў: партыі, працоўныя калектывы ды грамадзяне - шляхам збору подпісаў. Зыходзячы з гэтага, можна акрэсьліць і магчымыя кірункі супрацы. Па-першае, грамадзкія арганізацыі могуць вылучаць сваіх прадстаўнікоў у акруговыя ды ўчастковыя камісіі і зрабіць працэс працы камісіяў больш адкрытым. Па-другое, тыя палітыкі, што плянуюць вылучацца ад партыяў, усё роўна зьбіраюць подпісы "на ўсялякі выпадак". Таму актывісты грамадзкіх арганізацыяў могуць дапамагчы ў зборы подпісаў тым асобам, якія, стаўшы дэпутатамі, будуць улічваць інтарэсы іх мэтавай групы ў парлямэнце. І, па-трэцяе, назіраньне - вельмі істотны момант, бо грамадзкія арганізацыі, паводле заканадаўства, могуць ажыцьцяўляць назіраньне за выбарамі. Аб карысьці гэтага працэсу для выбараў і казаць залішне.

Мікола Статкевіч, старшыня Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная грамада):

- Найперш гэта барацьба супраць фальсыфікацыяў: гэта і вядзеньне маніторынгу СМІ, і назіраньне, і юрыдычная барацьба супраць нерэгістрацыі кандыдатаў. Другі, найбольш істотны кірунак супрацы - для нас менш актуальны праз неразьвітасьць трэцяга сэктару - гэта апора палітыкаў на трэці сэктар у камунікатыўным пляне, то бок забесьпячэньне кантактаў з выбарнікамі праз кантакты зь сябрамі НДА.

Валянціна Трыгубовіч, старшыня МГА "Беларуская пэрспэктыва":

- Партыі і грамадзкія аб'яднаньні - гэта пэўныя часткі грамадзянскай супольнасьці — разгалінаванай структуры, якая ёсьць у краіне. Адрозьненьне палітычных партыяў і грамадзкіх аб'яднаньняў палягае ў тым, што партыі змагаюцца за ўладу. Грамадзкім аб'яднаньням улада не патрэбная, яны рэалізоўваюць свае патрэбы пры любой уладзе, бо іх інтарэсы - гэта інтарэсы людзей, тое, чаго хочуць звычайныя людзі. І калі адна партыя імкнецца перамагчы іншую, дамагчыся паўнаты ўлады, яна павінна ўлічваць інтарэсы людзей, а дапамагчы ў гэтым могуць няўрадавыя арганізацыі. Я кажу "партыя" наўмысна: цяпер краінай таксама кіруе партыя - "партыя ўлады". Гэта група людзей, якая мае шэраг перамогаў над "партыяй апазыцыі". У нас існуе ненармальная сытуацыя, бо партыя ўлады карыстаецца бюджэтам дзеля дасягненьня сваіх палітычных мэтаў. Але ў бюджэце ж сабраныя грошы ўсіх, а фінансуе сябе з гэтай крыніцы толькі "партыя ўлады". І, каб перамагчы, "партыя апазыцыі" павінна сабраць мільён людзей, выпусьціць іх з інфармацыяй - гэта чалавечы рэсурс. А дапамога ў гэтым - грамадзкія арганізацыі, яны ж сочаць за выкананьнем інтарэсаў людзей. Яны таксама пільнуюць дэмакратычны закон, празрыстасьць, справядлівасьць выбараў. Гэта якраз справы грамадзкіх арганізацыяў. Ну і, зразумела, асьветніцкая праца для людзей, якія ўдзельнічаюць у выбарах - як тых, хто абіраецца, так і тых, хто абірае, - падрыхтоўка да сумленнай "гульні". Падсумую віды працы: аналітычная, праваабарончая і асьветніцкая.

Аляксей Янукевіч, намесьнік старшыні Партыі БНФ:

- Найперш, я лічу вельмі важным і карысным для палітычных сілаў, калі НДА не застануцца паза выбарчай кампаніяй. Трэці сэктар валодае рэальнымі каналамі атрыманьня інфармацыі аб праблемах пэўных групаў насельніцтва, бо грамадзкія арганізацыі маюць з насельніцтвам жывы кантакт. І таму, дарэчы, арганізацыі трэцяга сэктару самі зацікаўленыя ў тым, каб урад добра вырашаў праблемы той сфэры, у якой яны працуюць. З гэтага вынікаюць і формы супрацы. Першая і самая істотная, на мой погляд, — інфармацыйнае забесьпячэньне кандыдатаў — каб яны ведалі праблемы мэтавых групаў, турбаваліся гэтымі праблемамі, задумваліся, як яны будуць іх вырашаць. Другая форма ўзаемадзеяньня, таксама відавочная, датычыць ня ўсіх НДА, а толькі галіновых, тых, якія зацікаўленыя ў празрыстым, сумленным выбарчым працэсе і ня маюць іншых інтарэсаў. Задача такіх НДА палягае ў тым, каб падчас выбараў не было махлярства, каб усе працэсы былі зразумелыя, а ўлада ў выніку - падсправаздачная народу. А выбары - гэта галоўная форма такой справаздачнасьці. Палітычныя сілы ў гэтым таксама зацікаўленыя. У кожнай зь іх свае інтарэсы, але агульнае, што аб'ядноўвае ўсіх, - барацьба за справядлівыя ўмовы для людзей абіраць сабе ўладу. І гэтая супраца мусіць адбывацца абавязкова.

Аляксандар Яращук, **старшыня Беларускага кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў:**

- Формы ўзаемадзеяньня патрэбныя, тут ня можа быць іншага меркаваньня. У дэмакратычных партыяў ды НДА збольшага аднолькавыя мэты, адзін погляд на тое, што адбываецца ў краіне, і адна пазыцыя наконт таго, як ажыцьцяўляць зьмены ў яе палітычным курсе. Адсюль вынікае неабходнасьць узаемадзеяньня. У дадатак даволі часта гаворка можа ісьці пра адных і тых жа людзей. З усяго гэтага відавочна, што базыс, глеба для эфэктыўнай супрацы ёсьць. Лічу, што прыдатныя ўсе формы ўзаемадзеяньня, якія прывядуць да пазытыўнага выніку. На выбарчым участку, у прыватнасьці, гэта можа быць, так бы мовіць, ускосная падтрымка - калі сябры НДА выступаюць у ролі назіральнікаў альбо, што нашмат больш эфэктыўна, сябраў участковых камісіяў. А раз так, то пачынаць трэба з самага пачатку - з фармаваньня гэтых камісіяў, таму што, насамрэч, імі ўсё і скончыцца. І такая праца, няхай і не паўсюль, а толькі ў некаторых месцах, можа стацца пасьпяховай. Таму на першым этапе партыі павінны дапамагчы НДА, каб потым ужо яны дапамаглі партыям. Увогуле ж такія кампаніі даюць найлепшую магчымасьць выпрацоўкі мадэляў такіх узаемадзеяньняў.

Фота Андрэя Лянкевіча

Запісаў Зьміцер Дрыгайла

“Партнэрства” хоча наглядаць аб’ектыўна

20 ліпеня ў Менску грамадзкая ініцыятыва “Партнэрства” абвесьціла пра пачатак назіраньня за выбарамі ў палату прадстаўнікоў. Гэтая незарэгістраваная парасонавая структура аб’ядноўвае шэраг рэгіянальных НДА ў 45 рэгіёнах Беларусі і абяцае выправіць на выбарчыя ўчасткі 3 тысячы назіральнікаў.

Незарэгістраваная грамадзянская ініцыятыва “Партнэрства” паўстала ў 2002 г., на сёньняшні дзень яна мае чальцоў у 45 гарадох краіны. На прэс-канфэрэнцыі “Партнэрства” абвесьціла пра пачатак назіраньня за выбарамі ў палату прадстаўнікоў. “Больш за 3 тысячы нашых назіральнікаў будуць працаваць цягам чатырох месяцаў выбарчае кампаніі на 25% выбарчых участкаў па ўсёй тэрыторыі Беларусі”, — заявіў кіраўнік ініцыятывы Мікалай Астрэйка.

Лідэр “Партнэрства” цьвердзіць, што яго арганізацыя ўлічыла памылкі сваіх папярэднікаў — ініцыятывы “Незалежнае назіраньне”, якая ў 2001 г. спрабавала кантраляваць прэзыдэнцкія выбары. “Асноўнай памылкай было тое, што “Незалежнае назіраньне” насамрэч незалежным не было, — кажа М. Астрэйка. — Яно было створана для таго, каб падтрымаць дэмакратычных кандыдатаў. Калі вы называецеся аб’ектыўнымі — вы мусіце прытрымлівацца толькі закону і выяўляць парушэньні як з аднаго боку ўдзельнікаў выбарчай кампаніі, гэтак і з другога”.

З тае прычыны, што ініцыятыва не зарэгістраваная ў Міністэрстве юстыцыі, назіральнікі будуць вылучацца ад рэгіянальных НДА і з выкарыстаньнем збору подпісаў грамадзянаў.

Не дэпалітызаваныя, але дэпартызаваныя

У ліпені ў Горадні прайшоў зьезд Беларускай асацыяцыі рэсурсавых цэнтраў (БАРЦ), у якім удзельнічалі прадстаўнікі 30 гарадоў краіны. На сёньняшні дзень у ёй налічваецца 71 цэнтар, і палова зь іх — незарэгістраваныя.

Старшыня БАРЦ Аляксандар Мілінкевіч гаворыць, што сябры Асацыяцыі рэсурсавых цэнтраў непасрэдна ня ўдзельнічаюць у палітычным жыцьці. Але яны займаюцца мабілізацыйнай і адукацыйнай працай, дапамагаюць актывістам партый вывучаць заканадаўства, распаўсюджваць інфармацыю.

“Мы гаварылі пра супрацоўніцтва з партыямі, — распавядае А. Мілінкевіч. — Яно для нас выглядае так: мы кажам, што мы не дэпалітызаваныя, але — дэпартызаваныя. У тым сэнсе, што мы аднолькава гатовы дапамагаць усім партыям, якія жадаюць дэмакратычнага разьвіцьця Беларусі”. Не зважаючы на супрацьдзеяньне ўладаў, трэці сэктар краіны застаецца досыць масавай зьявай. Гэта можа азначаць, што ўладам не ўдалося дасягнуць сваёй мэты. Удзельнікі гарадзенскага зьезду адзначалі, што праца ў нелегальным становішчы, вядома, адрозьніваецца ад нармальнай, але гэта не зьмяншае ўплыву трэцяга сэктару ў рэгіёнах. Больш за тое, сёньня ў грамадзкія арганізацыі, асабліва ў малых гарадах, прыходзіць шмат моладзі.

Фота Андрэя Лянкевіча

Паводле радыё “Свабода”

Барысаўская стратэгія

У розных рэгіёнах Беларусі набірае моц парлямэнцкая кампанія. Цікавая сытуацыя складваецца ў Барысаве, дзе ёсьць папулярныя мясцовыя дэмакратычныя лідэры, уплывовая незалежная прэса і дзе людзі прыхільна ставяцца да апазыцыянэраў. Усе гэтыя дзейнікі ня проста прагнуць пазытыўных зьменаў, але і шмат зрабілі дзеля іх надыходу. "Што датычыць выбараў, для дэмакратычнага грамадзтва Барысава гэта ўжо фінішная прамая, - кажа адзін зь мясцовых лідэраў Сяргей Салаш. – Фактычна мы не пачынаем кампанію, а завяршаем яе. Час расстаўляць акцэнты".

Барысаўскія дэмакратычныя кандыдаты актыўна працуюць, праўда, у кожнага зь іх свая форма актыўнасьці. Хтосьці гэта робіць пераважна праз прэсу, хтосьці да гэтага яшчэ дадае і непасрэдны кантакт зь людзьмі. Тым ня менш, усе каманды настроеныя на перамогу і ўсе гатовыя дзеля гэтага актыўна працаваць. Адным зь іх імаверных супернікаў можа стацца дэпутат палаты прадстаўнікоў, адданы лукашыст Віктар Гумінскі. Таму варта чакаць ня проста змаганьня дэмакратаў зь нейкім дэпутатам Гумінскім і ягонай праграмай - у Барысаве адбудзецца адна з генэральных "боек" паміж апазыцыйнымі і праўладнымі сіламі.

Барысаўскія НДА па-рознаму ставяцца да выбараў. Некаторых палітыка ня вельмі моцна кранае, некаторыя яе проста баяцца, маючы нэгатыўны досьвед паразаў на мінулых выбарах. "А яшчэ ў нас ёсьць такія арганізацыі, якія будуць працаваць толькі ў выпадку нейкай матэрыяльнай зацікаўленасьці ў гэтай працы. Лічу, што гэта вельмі кепска", - кажа С. Салаш. Зь іншага боку, у Барысаве ёсьць НДА, якія ўжо вызначыліся, што будуць актыўна ўдзельнічаць у парлямэнцкай кампаніі. Паводле Салаша, іх сябры могуць працаваць у якасьці валанцёраў у камандах кандыдатаў, назіральнікамі, на іх будзе ляжаць і мабілізацыйная кампанія. Сябры НДА вылучаліся і ў акружныя камісіі, прычым подпісы за іх зьбіраліся вельмі добра - па 30-40 подпісаў за гадзіну.

Найважнейшай мясцовай падзеяй сёлета стаўся нядаўні выхад кнігі "Барысаў і рэгіён. Стратэгія разьвіцьця". Яе падрыхтавала грамадзкая ініцыятыва "За чысты Барысаў" (аўтары - асьпірант эканамічнага ўнівэрсытэту Зьміцер Бабіцкі, кандыдат эканамічных навук Уладзімер Валетка, студэнт-географ Алег Іваноўскі, лідэр ініцыятывы Сяргей Салаш і іншыя). У кнізе выкладзеная першая стратэгія разьвіцьця рэгіёну, чаго ў Беларусі яшчэ ніхто не рабіў. Стваральнікі "Стратэгіі разьвіцьця", гаворачы пра мэты выданьня, адзначаюць, што ім важна было паказаць грамадзтву наяўнасьць у незалежніцкіх сілаў праграмы дзеяньняў. А водгукі не прымусілі сябе чакаць. Людзі вельмі добра зрэагавалі на выданьне, у адрозьненьне ад мясцовых уладаў, якія вырашылі прамаўчаць. Ці не ад таго, што яны проста ня маюць чаго сказаць? Тым больш што ўсім відавочна - "Стратэгія разьвіцьця" гэта ня проста кніга, а праграма дзеяньняў каманды дэмакратаў на бліжэйшыя выбары ды й на будучыя выбарчыя кампаніі, напрыклад на мясцовыя выбары 2007 году.

Фота Ігаря Ардзеевай

Сяргей Салаш: «Дэмакратычныя сілы Барысава ўжо сасьпелі для таго, каб узяць уладу ў горадзе ў свае рукі».

Фактычна, дэмакратычныя сілы Барысава ўжо сасьпелі для таго, каб узяць у свае рукі ўладу ў горадзе, лічыць С. Салаш.

Але ўладная палітыка замоўчваньня час ад часу дае збоі. У красавіцкім нумары "Асамблеі" друкаваўся ліст чыноўніка, які прасіў Салаша дапамагчы яму ў арганізацыі суботніку. Відавочна, што мясцовыя ўлады ўжо ўспрымаюць яго хутчэй як палітыка, а не як грамадзкага дзеяча. У мінулым годзе С. Салаш спрабаваў свае сілы ў мясцовых выбарах, правёў моцную кампанію, але быў "вырублены" - зьняты з дыстанцыі. "Чытачы часопісу "Асамблея", напэўна, могуць здагадвацца, што я буду вельмі актыўна ўдзельнічаць у выбарах", - кажа ён. Ягоная каманда, дарэчы, актыўна працуе з барысаўчанамі: робіць абыход кватэраў, размаўляе зь людзьмі пра іх праблемы, прэзэнтуе "Стратэгію разьвіцьця". Калі "Барысаўская стратэгія" спрацуе, гэта будзе выдатны прыклад для дэмакратычных сілаў зь іншых рэгіёнаў.

"Грамадзкая ініцыятыва "За чысты Барысаў" існуе ўжо больш за два гады, - распавядае С. Салаш. - Яна яшчэ дастаткова маладая, дынамічная, але яе місія, на мой погляд, вечная. Яна будзе заўсёды запатрабаваная ў людзей. І ўладам практычна немагчыма нешта супрацьпаставіць нашай ініцыятыве. Ну хто супраць чыстага Барысава? Здаецца, ніхто. Усе - "за".

І сапраўды - з гэтым не паспрачаешся.

Вінцэсь Дземянчук

Пятрас Грэбляўскас: “Партыі зацікаўленыя ў нашай падтрымцы”

Пятрас Грэбляўскас

У Літве актыўна дзейнічае прафсаюз “Салідарнасьць”, які стварыўся яшчэ ў 90-х. У ягоны склад уваходзяць арганізацыі пятнаццаці галінаў гаспадаркі, а прафсаюзныя структуры існуюць у кожным раёне Літвы. Адным з стваральнікаў “Салідарнасьці” зьяўляецца юрыст Пятрас Грэбляўскас, які калісьці стаяў ля вытокаў рабочага руху гэтай краіны, адначасова браў актыўны ўдзел у працы праваабарончых арганізацыяў. П. Грэбляўскас - адзін з аўтараў дзейнага цяпер у Літве Працоўнага кодэксу. Сёньня першы намесьнік старшыні літоўскай “Салідарнасьці” сп. Грэбляўскас адказвае на пытаньні карэспандэнта “Асамблеі”.

- Нядаўна ў Літве адбыліся прэзыдэнцкія выбары. Які ўдзел у выбарах звычайна бяруць літоўскія грамадзкія арганізацыі?

- Так, мы бярэм удзел у выбарах. Паводле нашых законаў сьпісы кандыдатаў могуць складаць толькі партыйныя арганізацыі. Грамадзкія арганізацыі ня маюць права вылучаць кандыдатаў ні ў мясцовыя Саветы, ні ў Сэйм. На пачатку 90-х гг. яны такое права мелі, але пасьля былі яго пазбаўленыя. Сябры грамадзкіх арганізацыяў могуць уваходзіць у партыйныя сьпісы, а самі арганізацыі маюць права ўступаць з партыямі ў кааліцыі. Цяпер існуе такая кааліцыя, у якую ўваходзяць 6 арганізацыяў. Кааліцыя падтрымлівае былога прэзыдэнта Раландаса Паксаса. Туды ўваходзяць некаторыя лібэральна-дэмакратычныя партыі, Партыя ў абарону правасудзьдзя і грамадзкія арганізацыі. На восеньскіх парлямэнцкіх выбарах гэтая кааліцыя будзе працаваць.

- У Беларусі цяпер вядзецца дыскусія пра тое, якую ролю павінны граць грамадзкія арганізацыі ў выбарчым працэсе. Як гэтая праблема вырашаецца ў Літве?

- У назіраньні ўдзельнічаюць толькі партыйныя прадстаўнікі. Мы заключаем некаторыя пагадненьні з партыямі, якія найбольш адпавядаюць нашай пазыцыі. Калі партыя дэкляруе, што будзе адстойваць правы працоўных, мы яе падтрымліваем. Але тут ёсьць і нэгатыўны досьвед. Мы заключылі такую дамову ў 90-я гг. з партыяй кансэрватараў, і яны ўключылі ў свой сьпіс нашага старшыню прафсаюзу Пятраса Чакалініса. Яго абралі сябрам Сэйму. Але калі Чакалініс стаў дэпутатам, ён адвярнуўся ад нас і пачаў галасаваць супраць інтарэсаў працоўных. Мы былі проста ў шоку. Адклікаць яго было нельга, бо ён абіраўся па партыйных сьпісах. Партыя таксама ня можа адклікаць свайго дэпутата, бо ў Сэйме ён мае права выйсьці з адной партыі ці фракцыі і ўступіць у іншую. Тады мы вельмі моцна прайгралі...

На ўзроўні мясцовага самакіраваньня ў Літве існуюць трохбаковыя рады. У раду ўваходзяць тры бакі - улады, прафсаюзы і працадаўцы. Мэта дзейнасьці гэтых радаў - дасягнуць раўнавагі інтарэсаў працоўных і працадаўцаў. Гэта вельмі эфэктыўная праца, частка сацыяльнага дыялёгу. Сацыяльны дыялёг у грамадзтве - гэта адно з асноўных патрабаваньняў Эўрапейскага Зьвязу. Такі дыялёг спрашчае непаразуменьні і садзейнічае дасягненьню прагрэсу.

- Сябры НДА, акрамя таго што галасуюць за кандыдата, які яшчэ ўдзел бяруць у выбарчым працэсе?

- Напрыклад, калі ідзе перадвыбарчая агітацыя, мы запрашаем усіх кандыдатаў на свае рады і дыскутуем, як гэты чалавек у якасьці дэпутата будзе сябе паводзіць, як будзе прадстаўляць нашыя інтарэсы. Мы аналізуем праграмы ўсіх партыяў, глядзім, якія пункты адпавядаюць нашым прынцыпам, якія не адпавядаюць. Ёсьць партыі, пра якія мы ведаем, што зь імі няма сэнсу размаўляць. Нават калі мы запросім кандыдата ад гэтых партыяў, ён да нас ня пойдзе. Гэта, напрыклад, лібэралы, якія кажуць, што прафсаюзы зусім не патрэбныя.

- Палітычныя партыі зацікаўленыя ў падтрымцы няўрадавых арганізацыяў?

- Абавязкова, бо гэта для іх вялікая падтрымка. “Салідарнасьць” мае ў раёнах тэрытарыяльныя арганізацыі і галіновыя прафсаюзы. У кожным раёне мы дапамагаем зьбіраць подпісы, выпускаем газэту “Рабочы Літвы”. Наклад яе невялікі - каля тысячы асобнікаў. Газэта сама па сабе не акупаецца, але я лічу, што гэта наша вялікае дасягненьне. Кожны нумар мы перадаем у Сэйм. У газэце выкладаецца нашая пазыцыя адносна выбараў і кандыдатаў.

Увогуле, СМІ ў Літве цяпер вельмі рэакцыйныя... Толькі наша газэта і яшчэ адно незалежнае выданьне выказваюць альтэрнатыўную думку. Усе іншыя СМІ, асабліва тэлебачаньне, асьвятляюць падзеі вельмі аднабакова.

Калі казаць пра агульны ўплыў грамадзкіх арганізацыяў, то ён даволі слабы. У нас няма закону аб грамадзкіх арганізацыях, існуе толькі Закон аб асацыяцыях, у якім

Палата прадстаўнікоў - за справядлівыя выбары

Палата прадстаўнікоў Кангрэсу ЗША напрыканцы ліпеня прыняла рэзалюцыю па Беларусі. Яе ініцыятарам выступіў кангрэсмэн Даглас Бэройтэр ад штату Нэбраска, і за яе аднагалосна прагаласавалі ўсе кангрэсмэны. Зьмяшчаем пераклад гэтага дакумэнту з сайту www.svaboda.org.

З рэзалюцыі № 652 Палаты прадстаўнікоў Кангрэсу ЗША, дзе ўлады Рэспублікі Беларусь заклікаюцца забясьпечыць дэмакратычны, празрысты і справядлівы выбарчы працэс на парлямэнцкіх выбарах восені 2004 году: «Беручы пад увагу, што забесьпячэньне дэмакратычнага, празрыстага і справядлівага выбарчага працэсу на парлямэнцкіх выбарах 2004 году ў Рэспубліцы Беларусь і ўсталяваньне сапраўды дэмакратычнай палітычнай сыстэмы зьяўляюцца перадумовамі інтэграцыі гэтай краіны ў Заходнюю супольнасьць дзяржаваў;

Беручы пад увагу, што ўлады Беларусі, дзяржавы-ўдзельніцы Арганізацыі бясьпекі і супрацоўніцтва ў Эўропе, узялі на сябе шматлікія канкрэтныя абавязкі ў справе правядзеньня выбараў, у тым ліку палажэньні Капэнгагенскага дакумэнту;

Беручы пад увагу, што выбары ў наступны парлямэнт Беларусі ўвосень 2004 году стануцца недвухсэнсоўнай праверкай таго, у якой меры беларускія ўлады застануцца верныя абавязку выконваць гэтыя стандарты і будаваць дэмакратычнае грамадзтва, заснаванае на прынцыпах свабодных выбараў і прававой дзяржавы;

Беручы пад увагу, што папярэднія парлямэнцкія выбары ў Беларусі не адпавядалі ў поўнай меры міжнародным стандартам;

Беручы пад увагу, што ўрад і публічныя ўлады на ўсіх узроўнях маюць сваім абавязкам дзейнічаць у адпаведнасьці з усімі законамі і прававымі нормамі, якія рэгулююць выбарчыя працэдуры, а таксама забясьпечваць свабодныя і справядлівыя выбары па ўсёй краіне, улучна з прадухіленьнем дзеяньняў, скіраваных на падрыў свабоднага ажыцьцяўленьня палітычных правоў;

выстаўляюцца вельмі жорсткія патрабаваньні. Пэўны час таму я рэгістраваў новы грамадзкі рух "За справядлівасьць і правасудзьдзе ў Літве" і сутыкнуўся зь вельмі вялікімі складанасьцямі. Напачатку трэба было ўсе дакумэнты зацьвердзіць у натарыюса. Каб легальна атрымаць права мець рахунак у банку, трэба было прайсьці складаныя бюракратычныя перашкоды...

- Як зьмянілася сытуацыя з грамадзкімі арганізацыямі ў Літве пасьля ўступленьня краіны ў Эўразьвяз? Ці зьмянілася яна ўвогуле?

- Я думаю, што сытуацыя памянялася ў лепшы бок. Цяпер адкрываюцца новыя магчымасьці для атрыманьня дапамогі з фондаў ЭЗ. Трэба толькі скласьці праграму для адукацыі. Я думаю, што гэты фактар крыху асьвяжыць грамадзкія арганізацыі ў Літве, бо большасьць НДА цяпер фактычна ня дзейнічаюць. Засталіся лідэры, якія паміж сабой шмат разоў перасварыліся, нешта не падзялілі... Гэта такая асаблівая рыса літоўскіх лідэраў. Яны ствараюць грамадзкую арганізацыю, пасьля нешта ня могуць падзяліць, і, як вынік, арганізацыя распадаецца.

- Ці ёсьць у Вас працоўныя кантакты зь Беларусьсю? Ці даходзіць да Вас інфармацыя пра стан рэчаў у нашай краіне?

- Я лічу, што новыя дэмакратычныя беларуская прафсаюзы былі проста зьнішчаныя. На сёньняшні дзень мы больш супрацоўнічаем з украінскімі і нават з грузінскімі прафсаюзамі, а зь Літвой, Латвіей і Эстоніяй стварылі міждзяржаўнае прафсаюзнае аб'яднаньне. Але і ў дачыненьнях зь Беларусьсю сытуацыя зьменіцца. Тое, што мы робім сумесна з ПЦ "Вясна", - гэта вельмі добры крок наперад.

Ядвіга Мацкевіч

Беручы пад увагу, што сапраўды свабодныя і справядлівыя выбары патрабуюць правядзеньня палітычнай кампаніі ў асяродзьдзі, у якім ні адміністрацыйныя дзеяньні, ні гвалт, запалохваньні або затрыманьні не перашкаджалі б партыям, палітычным згуртаваньням і кандыдатам знаёміць грамадзянаў са сваімі поглядамі і якасьцямі праз арганізацыю групаў падтрымкі, правядзеньне публічных сходаў і мерапрыемстваў па ўсёй краіне і выкарыстаньне бесьперашкоднага доступу да друку, радыё, тэлевізіі і інтэрнэтных сродкаў масавай інфармацыі на раўнапраўнай аснове;

Беручы пад увагу, што сапраўды свабодныя і справядлівыя выбары патрабуюць, каб грамадзянам было гарантаванае права і рэальная магчымасьць ажыцьцяўляць свае грамадзянскія і палітычныя правы, улучна з правам выбару, без запалохваньня, пагрозаў палітычнага перасьледу або іншых формаў прымусу з боку цэнтральных, мясцовых або іншых уладаў; Беручы пад увагу, што сапраўды свабодныя і справядлівыя выбары патрабуюць поўнай празрыстасьці законаў і прававых нормаў, якія рэгулююць правядзеньне выбараў, шматпартыйнага прадстаўніцтва ў выбарчых камісіях і бесьперашкоднага доступу кандыдатаў, палітычных партыяў, мясцовых і замежных наглядальнікаў да ўсіх выбарчых працэдураў, улучна з галасаваньнем і падлікам галасоў ва ўсіх рэгіёнах краіны;

Беручы пад увагу, што кантроль і маніпуляцыі ў дачыненьні да сродкаў масавай інфармацыі з боку цэнтральных і мясцовых чыноўнікаў ды іншых асобаў, якія дзейнічаюць паводле іхных загадаў, маглі б выклікаць сур'ёзную занепакоенасьць што да гатовасьці беларускіх уладаў выконваць свае абавязаньні ў справе свабодных і справядлівых выбараў;

Беручы пад увагу, што намаганьні цэнтральных і мясцовых чыноўнікаў ды іншых асобаў, якія дзейнічаюць паводле іхных загадаў, стварыць перашкоды ажыцьцяўленьню свабоды сходаў, свабоды слова і правядзеньню свабоднай і справядлівай палітычнай кампаніі маглі б паставіць пад сумнеў справядлівасьць будучых выбараў; і

Беручы пад увагу, што арышт або запалохваньне актывістаў і кандыдатаў апазыцыйных палітычных партыяў, такіх, як лідэр Аб'яднанай грамадзянскай партыі, або іншых асобаў, зьвязаных з апазыцыяй, у тым ліку і тых, хто мае дачыненьне да Кааліцыі «Пяцёрка Плюс», уяўляе сабою сьвядомы наступ на дэмакратычны працэс; Вось жа, улічваючы зазначанае вышэй, хай будзе пастаноўлена, што Палата Прадстаўнікоў -

(1) спадзяецца на разьвіцьцё сардэчных дачыненьняў паміж Злучанымі Штатамі і Рэспублікай Беларусьсю;

(2) падкрэсьлівае, што перадумова інтэграцыі Беларусі ў Заходнюю супольнасьць дзяржаваў палягае ва ўсталяваньні сапраўды дэмакратычнай палітычнай сыстэмы;

(3) выказвае сваю моцную і няспынную падтрымку намаганьням беларускага народу ўсталяваць поўную дэмакратыю, вяршэнства закону і павагу да правоў чалавека ў Беларусі;

(4) заклікае ўлады Беларусі гарантаваць свабоду асацыяцыяў і сходаў, улучна з правам кандыдатаў, сяброў палітычных партыяў ды іншых свабодна зьбірацца, арганізоўваць і праводзіць публічныя мерапрыемствы і ажыцьцяўляць гэтае ды іншыя правы без запалохваньня і цкаваньня з боку цэнтральных або мясцовых чыноўнікаў або іншых асобаў, якія дзейнічаюць паводле іхных загадаў;

(5) заклікае ўлады Беларусі выконваць свае абавязкі перад Арганізацыяй бясьпекі і супрацоўніцтва ў Эўропе ў справе дэмакратычных выбараў;

(6) заклікае беларускія ўлады забясьпечыць -

(A) поўную празрыстасьць выбарчых працэдураў да, падчас і пасьля парлямэнцкіх выбараў 2004 году;

(B) свабодны доступ да выбараў беларускіх і міжнародных наглядальнікаў;

(C) шматпартыйнае прадстаўніцтва ва ўсіх выбарчых камісіях;

(D) бесьперашкодны доступ усіх партыяў і кандыдатаў да друку, радыё, тэлевізіі і інтэрнэтных сродкаў масавай інфармацыі на раўнапраўнай аснове;

(E) свабоду кандыдатаў, актывістаў апазыцыйных партыяў і незалежных сродкаў масавай інфармацыі ад запалохваньня і цкаваньня з боку ўладных чыноўнікаў на ўсіх узроўнях, якія, сярод іншага, выяўляюцца ў выбарачных падатковых праверках, адкліканьні ліцэнзіяў, пакараньнях за абразу гонару і годнасьці;

(F) празрыстасьць працэсу разгляду скаргаў і апэляцыяў у выбарчых камісіях і ў судовых установах з мэтай своечасовага і эфэктыўнага вырашэньня спрэчных пытаньняў; і

(G) рашучае прыцягненьне да адказнасьці любых асобаў або арганізацыяў, вінаватых у парушэньні выбарчых законаў і нормаў, аж да ўжываньня адпаведных адміністрацыйных або крымінальных пакараньняў;

(7) надалей заклікае ўлады Беларусі гарантаваць наглядальнікам ад Бюро дэмакратычных інстытутаў і правоў чалавека, іншых краінаў-удзельніц АБСЭ, беларускіх палітычных партыяў, прадстаўнікоў кандыдатаў, няўрадавых арганізацыяў ды іншых прыватных установаў і арганізацыяў, як замежных, гэтак і мясцовых, бесьперашкодны доступ да ўсіх аспэктаў выбарчага працэсу, улучна зь бесьперашкодным доступам да публічных кампаніяў, кандыдатаў, сродкаў інфармацыі, галасаваньня і пасьлявыбарчай апрацоўкі дадзеных, а таксама разгляду выбарчых праблемаў і скаргаў;

(8) заахвочвае міжнародную супольнасьць, улучна з Радай Эўропы, АБСЭ і Парлямэнцкай Асамблеяй АБСЭ, працягваць іх намаганьні, скіраваныя на падтрымку дэмакратыі ў Беларусі, і заклікае гэткія краіны, як Літва ды іншыя балтыйскія і паўночныя краіны, працягваць аказваць дапамогу няўрадавым арганізацыям ды іншым беларускім арганізацыям, якія дзейнічаюць на карысьць пашырэньня дэмакратыі і справядлівых выбараў у Беларусі; і

(9) абяцае сваю падтрымку беларускаму народу, ягонай адданасьці цалкам свабоднай і адкрытай дэмакратычнай сыстэме, стварэньню ім квітнеючай і свабоднай рынкавай эканомікі і заняцьцю ягонай краінай належнага месца ў якасьці раўнапраўнай удзельніцы Заходняй супольнасьці дэмакратычных дзяржаваў».

Менск

АБ'ЯДНАЛІСЯ БЕЛАРУСКІЯ АЎГАНЦЫ

21 чэрвеня ў Беларусі зарэгістраванае міжнароднае грамадзкае аб'яднаньне "Афганская община, Землячество и Беженцы". Дата рэгістрацыі аб'яднаньня якраз супала з днямі ўцекачоў, якія сьвяткаваліся ў нашай краіне.

Беларусь лічыцца краінай з найлепшымі ўмовамі для ўцекачоў ва ўсім СНД, але праблемаў у іх усё роўна хапае. Найбольшая зь іх — атрыманьне працы. Большасьць уцекачоў працуе на рынках, прычым часьцей за ўсё гэтыя людзі маюць беларускія (БССРаўскія) дыплёмы аб вышэйшай адукацыі. Нягледзячы на тое што заканадаўства Беларусі гарантуе ўцекачам аднолькавыя зь беларускімі грамадзянамі магчымасьці ўладкаваньня на працу, на практыцы яе знайсьці амаль немагчыма. Так, адзін з уцекачоў, які жыве ў Менску, спрабаваў уладкавацца на працу энэргетыкам, паводле свайго дыплёму БПІ, але няўдала, бо ня меў працоўнай кніжкі.

Уладкаваньне на працу ўскладняецца тым фактам, што статус уцекача заўжды часовы, ён выдаецца толькі на пэўны тэрмін, а значыць, і працу можна шукаць толькі часовую. У маленькіх гарадках і беспрацоўе, і варожасьць людзей — яшчэ больш частыя зьявы, чым у Менску. Аўганцы прызнаюцца, што агрэсіўнае стаўленьне і пагрозы ў свой адрас прыходзіцца чуць дастаткова часта, нават ад людзей, якія ўвасабляюць уладу, — міліцыянтаў.

З скаргамі на непрацаўладкаваньне даволі шмат аўганцаў зьвярталася ў юрыдычную кансультацыю, якая працавала пры аб'яднаньні. А пры цэнтры дзіцячай творчасьці "Эўрыка" працуе школа для грузінскіх і аўганскіх дзяцей. Там жа аўганцы выдаюць свой часопіс.

Вольга Мікалайчык

Барысаў

ФУТБОЛ ЯК СРОДАК БЕЛАРУСІЗАЦЫІ

Барысаў мае ўсе шансы быць прызнаным сталіцай беларускага НДАшнага спорту. Найперш гэта

датычыць футболу, які надзвычай папулярны ў гэтым горадзе. А ўсё пачалося з таго, што ў 90-я барысаўскі БАТЭ стаў чэмпіёнам Беларусі ў футболе. 27 ліпеня ў Барысаве вызначыцца чарговы ўладальнік Кубку Незалежнасьці — футбольнага турніру, які праводзіцца мясцовымі грамадзкімі актывістамі.

Вось ужо 5 гадоў у Барысаве праводзяцца футбольныя чэмпіянаты на Кубак Незалежнасьці. Звычайна ў іх бяруць удзел дваровыя каманды з Гомелю, Маладэчна, Жодзіна, Смалявічаў, Берасьця і, натуральна, Барысава. На адборачныя турніры летась даслалі заяўкі толькі з Барысава і навакольляў аж 40 камандаў. Гэта было яўна замнога, і арганізатарам давялося іх "адсейваць", каб дапусьціць да ўдзелу ў турніры толькі 16 камандаў. Цяпер аматары футболу баяцца прапусьціць турнір і тэлефануюць арганізатарам загадзя. У арганізацыі футбольнага турніру дапамагаюць мясцовыя прадпрымальнікі.

Турніры праводзяцца пад белчырвона-белым сьцягам, а фінал адбываецца 27 ліпеня, у дзень абвяшчэньня Дэклярацыі аб незалежнасьці Беларусі. "Пад гэтым сьцягам нашы футбалісты выйграюць альбо прайграюць, усе турнірныя раскладкі ў нас на беларускай мове, на ёй размаўляюць і арганізатары турніру, і судзьдзі. У гэтым найбольшая карысьць ад яго. Але такі чэмпіянат варта было б ладзіць хаця б толькі дзеля спорту, таму што ўлады зусім не займаюцца моладзьдзю", — кажа Зьміцер Бародка, старшыня моладзевага цэнтру "Волат" і арганізатар чэмпіянату.

Варта адзначыць, што, паводле Стратэгіі разьвіцьця Барысава і рэгіёну, выдадзенай грамадзкай ініцыятывай "За чысты Барысаў!", кожны другі жыхар Барысава адзначае недахоп спартова-аздараўленчых установаў у горадзе.

Вольга Мікалайчык

Віцебск

ПРАДПРЫМАЛЬНІКІ АДРАМАНТАВАЛІ БОЛЬНІЧНУЮ ПАЛАТУ

У Віцебскай гарадзкой клінічнай больніцы хуткай дапамогі здадзеная ў эксплюатацыю больнічная палата, адрамантаваная мясцовымі прадпрымальнікамі на ўласныя сродкі.

Ідэя дапамогі Віцебскай гарадзкой клінічнай больніцы хуткай дапамогі зьявілася падчас абмеркаваньня мясцовых сацыяльных праблемаў, якое было зладжанае дэпутатам мясцовага гарсавету Станіславам Ляхоўскім. Тады некаторыя прысутныя бізнэсоўцы і прапанавалі аказаць канкрэтную дабрачынную дапамогу лячэбнай установе. З кіраўніцтвам больніцы

была ўзгодненая мадэрнізацыя пасьляапэрацыйнай палаты, дзе лякуюцца цяжкахворыя. Рамонт зрабіла фірма "Арэол", мэблю даставіла "Альянс-мебель", сантэхніку перадаў гандлёвы дом "Керамін", жалюзі ўсталявала ТДА "БИС". Унёсак у фінансаваньне дабрачыннай акцыі зрабіў і прадпрымальнік Станіслаў Ляхоўскі. Удзельнікі акцыі разьлічваюць, што іхная ініцыятыва будзе працягнутая прадпрымальніцкімі коламі. С. Ляхоўскі спадзяецца, што яна стане "пачынам для іншых бізнэсоўцаў, якія жадаюць рабіць добрую справу ў галіне аховы здароўя".

Вітальд Гамбровіч

Горадня

КДБ У РОЛІ ЗАМОЎЦЫ

Падчас разгляду скаргі Грамадзкага аб'яднаньня "Воля да разьвіцьця" да Інспэкцыі Міністэрства па падатках і зборах г. Слоніму ў Гаспадарчым судзе Гарадзенскай вобласьці высьветлілася, што да "справы TACIS" мае непасрэднае дачыненьне Камітэт дзяржбясьпекі.

Слонімская падатковая інспэкцыя падала ў суд тлумачэньне абставінаў, што сталіся падставай для праверкі арганізацыі і накладаньня на яе фінансавых санкцыяў. У прыватнасьці, адзначаецца, што "пажаданьне" зьвярнуць увагу падатковай інспэкцыі да ГА "Воля да разьвіцьця" было выказанае непасрэдна органамі КДБ. "Прадстаўнікі падатковай папросту паказалі суду, хто сапраўды ініцыяваў ціск на аб'яднаньне, — кажа юрыст Ю. Чавусаў, які прадстаўляў у судзе інтарэсы ГА "Воля да разьвіцьця". — На просьбу КДБ была праведзеная праверка арганізацыі ў 2003 годзе, але яна ня выявіла парушэньняў. Замоўца застаўся незадаволены такім вынікам, і падаткавікі былі вымушаныя правесьці паўторную праверку з вызначаным вынікам у выглядзе фінансавых санкцыяў. Гэта відавочна палітычная справа, скіраваная на зьнішчэньне моцнай няўрадавай арганізацыі".

Юры Патоцкі

Ворша

ПЕРШАЕ ПАСЕДЖАНЬНЕ "АЛЬЯНСУ"

9 чэрвеня ў Воршы прайшло першае паседжаньне грамадзкага клюбу "Аршанскі альянс", у якім узялі ўдзел прадстаўнікі НДА і ўладаў.

Аршанскі грамадзкі клюб, створаны няўрадавымі арганізацыямі "Зьвяз", ТБМ, цэнтар "Крывіч", Беларуская арганізацыя працоўных жанчын і Асацыяцыя дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам, закліканы выяўляць і вырашаць лякальныя праблемы.

На першым паседжаньні клюбу, куды былі запрошаныя прадстаўнікі дзяржаўных структураў, грамадзкія актывісты пазнаёмілі прысутных з вынікамі анкетаваньня аршанцаў дзеля вызначэньня мясцовых праблемаў.

Удзельнікі прапанавалі прысутным прадстаўнікам уладаў шэраг цікавых ідэяў для супольнай рэалізацыі. Так, была абмеркаваная ідэя адкрыцьця невялікіх кавярняў уздоўж Дняпра, дзе магла б адпачываць моладзь. Паводле вынікаў праведзенага дасьледаваньня, маладыя людзі найбольш наракалі на адсутнасьць дастатковай колькасьці месцаў адпачынку.

Аднак, паводле словаў аднаго з арганізатараў Алеся Шутава, "прадстаўнікі дзяржаўных структураў былі непадрыхтаваныя да нашых канкрэтных прапановаў. Таму да пачатку рэалізацыі выказаных намі ідэяў яшчэ далёка".

Ягор Клішэвіч

МАЛАДЫЯ САЦДЭМЫ АДУЖАЛІ ЎСІХ

У прыгарадзе Воршы, каля чыгуначнай станцыі Харобрава, прайшоў другі па ліку спартовы фэстываль дэмакратычных арганізацыяў Воршы. Ягоным арганізатарам і старшынём аргкамітэту, як і летась, быў старшыня гарадзкой арганізацыі Свабоднага прафсаюзу Беларускага (СПБ) Сяргей Марусенка. Сёлета ў арганізацыі яму дапамагалі прадстаўнік бараньскай арганізацыі БСДП "Народная Грамада" Віктар Міхасёў і сябры Аршанскай гарадзкой арганізацыі "Маладыя сацыял-дэмакраты" (МСД) Аляксей Казакевіч і Андрэй Пяткевіч. Дарэчы, МСД 60-я ўгодкі вызваленьня Беларусі адзначылі добраўпарадкаваньнем памятнага знаку і брацкай магілы ахвяраў палітычных бальшавіцкіх рэпрэсіяў у прыгарадзе Воршы, пра якія ўлады "забыліся"...

У двухдзённым фэстывалі бралі ўдзел чатыры каманды: СПБ, МСД, зборная арганізацыяў Барані і каманда экалягічнай арганізацыі "Чысты сьвет". У першы дзень, пасьля ўрачыстага адкрыцьця з узьняцьцем нацыянальнага бел-чырвона-белага сьцяга, прайшлі футбольныя спаборніцтвы і конкурс мастацкай самадзейнасьці камандаў. У выніку мацнейшымі былі футбалісты-прафсаюзьнікі, а ў конкурсе перамаглі "Маладыя сацыял-дэмакраты". Апошнія былі спрытнейшымі і мацнейшымі ў гульнёвай камбінаванай эстафэце, якая адбылася на наступны дзень.

Конкурс на найлепшы плякат выйграла каманда з Барані. А завяршылася сьвята захапляльным спаборніцтвам — перацягваньнем каната. І зноў каманда МСД адужала ўсіх супернікаў і заваявала прыз — керамічны кубак з эмблемай фэстывалю. Падарункавымі керамічнымі пано з выявамі Ўладзімера Караткевіча і Хрыстафора Радзівіла былі ўзнагароджаны каманды СПБ і Барані, якія занялі адпаведна другое і трэцяе месцы. Усе каманды-ўдзельніцы таксама атрымалі дыплёмы аргкамітэту гэтага незвычайнага спартыўнага фэстывалю.

Юры Копцік

Магілёў

ПАЛІТЫКІ ШУКАЮЦЬ НОВУЮ МОЛАДЗЬ

У Магілёве адбылося чарговае паседжаньне арганізацыяў — заснавальнікаў цэнтру "Салідарнасьць". Актывісты "Маладой грамады" і "Маладыя сацыял-дэмакраты" абмяркоўвалі, ці здолелі яны аб'яднацца за тры месяцы і што было зроблена дзеля прыцягненьня новай моладзі ў шэрагі сацдэмаў.

Згуртаваць новую моладзь вакол сацыял-дэмакратычных арганізацыяў Магілёўшчыны, разьвіць шэраг новых грамадзкіх паслугаў для студэнтаў і маладых людзей Магілёва быў закліканы створаны 12 сакавіка гэтага году цэнтар "Салідарнасьць". Як было адзначана на чарговым паседжаньні, за тры месяцы сваёй працы цэнтар правёў антыфашыстоўскі тыдзень (былі замаляваныя фашыстоўскія лёзунгі на сьценах гораду, праведзеная лекцыя для школьнікаў), стварыў дыскусійны клюб, дзякуючы якому ўжо зьявіліся каля двух дзясяткаў новых людзей. У далейшыя пляны цэнтру, як адзначылі задаволеныя вынікамі сваёй працы заснавальнікі, павінен увайсьці пошук шляхоў пашырэньня сваёй дзейнасьці на большае кола моладзі.

Ягор Клішэвіч

{ ДАЙДЖЭСТ }

Сацыяльная адказнасьць бізнэсу

Больш за 20 беларускіх кампаніяў аб'ядналіся ў праекце "Ініцыятыва за сацыяльную адказнасьць бізнэсу", галоўнымі мэтамі якога стануць укараненьне ў беларускіх кампаніях сацыяльнай справаздачнасьці паводле міжнародных стандартаў, рэалізацыя сацыяльна значных праектаў і зьмена падатковай палітыкі дзяржавы ў дачыненьні да дабрачыннасьці.

Пра гэта ініцыятары праекту паведамілі на прэс-канфэрэнцыі ў Менску. Сярод удзельнікаў - міжнародны аўтамабільны холдынг "Атлант-М", буйнейшы камэрцыйны банк краіны Беларусбанк, British American Tobacco, СП ЗАТ "Мілавіца" ды інш.

Акрамя таго, ініцыятыва аб'ядная вядучыя беларускія дасьледчыя і кансалтынгавыя арганізацыі: цэнтар сыстэмных бізнэс-тэхналёгіяў "Satio", лябараторыю "Новак", аналітычны цэнтар "Стратэгія" і г. д. На любым этапе да ініцыятыўнай групы могуць далучыцца ўсе зацікаўленыя прадпрыемствы і прыватныя асобы, якія падзяляюць каштоўнасьці сацыяльнай адказнасьці і мэты праекту.

Арганізатары паведамілі, што сярод першых мерапрыемстваў ініцыятывы будзе арганізацыя летняй школы-форуму маладых бізнэсоўцаў і навукоўцаў, правядзеньне маніторынгу "Сацыяльная адказнасьць бізнэсу Беларусі", навукова-практычная канфэрэнцыя па праблемах САБ ды інш. Акрамя таго, як ужо паведамлялася, сур'ёзную ўвагу плянуецца надаць разбурэньню стэрэатыпаў у адносінах да прадпрымальніка як істоты, чые невысокія маральныя ўстаноўкі дазваляюць атрымліваць вялікія грошы нізкапробнымі спосабамі. У плянах таксама вывучэньне масавай сьвядомасьці беларусаў і, у прыватнасьці, таго, што для іх значыць паняцьце "рынак", як самі беларускія кампаніі ставяцца да сацыяльна значных праграмаў і наколькі яны гатовыя да дабрачыннасьці.

Самым амбіцыйным праектам ініцыятывы стане заканадаўчая праца дзеля вызваленьня ад падаткаабкладаньня прыбытку, які кампаніі накіроўваюць на падтрымку сацыяльных праграмаў.

"Нацыянальны бізнэс пачаў ідэнтыфікаваць сябе ў грамадзтве як сацыяльная група, эканамічная эліта, здольная ўзяць на сябе сацыяльную адказнасьць і апекавацца каштоўнасьцямі ў грамадзтве. Зь іншага боку, гэта тыя кірункі, дзе дзяржава проста не пасьпявае, ня можа і ня хоча працаваць", - заявіў кіраўнік НДЦ "Стратэгія" Леанід Заіка.

Удзельнікі адзначылі, што ні ў якім разе ня ставяць перад сабой палітычныя мэты і не плянуюць у выніку стварыць нейкую бізнэс-структуру, якая б супрацьпастаўлялася ўжо існым. Акрамя таго, яны пакуль не плянуюць і стварацьадмысловы фонд, які б акумуляваў сродкі для рэалізацыі асобных праектаў. Хаця ня выключана, што гэта стане наступным этапам разьвіцьця ініцыятывы.

"Белорусский рынок", 28 чэрвеня 2004 г.

Падчас падрыхтоўкі чарговага нумару часопісу "Асамблея" ў судах Беларусі адбываліся дзіўныя (у рэчышчы падзеяў апошняга часу) справы: прызнаная правата няўрадавых арганізацыяў і грамадзкіх актывістаў. Такім чынам, сёньня мы хочам павіншаваць пераможцаў, якія даказалі, што нават у гэтай краіне можна перамагаць.

ЗЬМІЦЕР САЛАЎЁЎ

Ён распачаў месяц НДАшных перамогаў. 21 чэрвеня ў Наваполацкім гарадзкім судзе завяршыўся судовы разгляд скаргі праваабаронцы Зьміцера Салаўёва да Інспэкцыі па падатках і зборах па г. Наваполацку. Суд вынес рашэньне на карысьць праваабаронцы.

Нагадаем: З. Салаўёва сёлета ў траўні аштрафавалі мясцовыя падаткавікі на 190 000 рублёў за тое, што ў сакавіку 2004 г. ён не пусьціў супрацоўнікаў інспэкцыі ў свой офіс. За гэта на яго быў складзены адміністрацыйны пратакол, у якім адзначалася, што сп. Салаўёў замінаў правядзеньню праверкі. У судзе высьветлілася, што загад, паводле якога мусіла ладзіцца праверка, быў афармлены некарэктна, і нагул для правядзеньня праверкі не было законных падставаў.

21 чэрвеня судзьдзя Альбіна Бандарчук прызнала дзеяньні супрацоўнікаў Інспэкцыі па падатках і зборах неправамоцнымі. Таксама паводле яе рашэньня адміністрацыйная справа ў дачыненьні да Зьміцера Салаўёва была спыненая, штраф, які ўжо быў сплачаны праваабаронцам, яму павінны вярнуць. А падатковая інспэкцыя мусіць сплаціць судовую пошліну.

Фота Глеба Лабадзенкі

Фота Глеба Лабадзенкі

ТАЦЯНА ПРОЦЬКА

Менскі гаспадарчы суд 23 чэрвеня адмяніў фінансавыя санкцыі, накладзеныя на рэспубліканскае грамадзкае аб'яднаньне "Беларускі Хельсынскі Камітэт" за нібыта нявыплату падаткаў са сродкаў, атрыманых па грантах у межах праграмы TACIS. Інтарэсы арганізацыі ў судзе прадстаўлялі старшыня БХК Тацяна Процька, Алег Гулак і Гары Паганяйла. Нашыя віншаваньні!

Менскі гаспадарчы суд прызнаў абгрунтаванымі патрабаваньні БХК і задаволіў іх у поўным аб'ёме: з арганізацыі зьнятае абвінавачаньне ў нявыплаце падаткаў, адмененыя фінансавыя санкцыі, а з падатковай інспэкцыі спагнаныя ўсе судовыя выдаткі. У аснову рашэньня пакладзеныя аргумэнты БХК пра першаснасьць міжнародных пагадненьняў аб беспадатковым рэжыме выкарыстаньня сродкаў праграмы TACIS.

Такім чынам, крымінальная справа, узбуджаная супраць Т. Процькі, фактычна развалілася. Непрызнаньне гаспадарчым судом факту нявыплаты арганізацыяй падаткаў сьведчыць пра адсутнасьць у дзеяньнях яе кіраўніцтва складу злачынства. Пасьля набыцьця законнай моцы рашэньня суду гэтая крымінальная справа будзе канчаткова спыненая. Прадстаўнікі БХК адзначаюць, што вельмі важную ролю ў пазытыўным судовым рашэньні адыграла жорсткая пазыцыя міжнародных інстытуцыяў.

P.S. 29 ліпеня Гаспадарчы суд г. Менску ў касацыйнай інстанцыі пацьвердзіў рашэньне пра неабгрунтаванасьць накладзеных на БХК фінансавых санкцыяў.

МІХАСЬ ВАРАНЕЦ

12 ліпеня Гаспадарчы суд Гарадзенскай вобласьці задаволіў іск грамадзкага аб'яднаньня "Воля да разьвіцьця". Рашэньне падатковай інспэкцыі па г. Слоніме аб спагнаньні з арганізацыі падаткаў у памеры 15 млн рублёў за сродкі, атрыманыя ад Эўрапейскай камісіі ў межах праграмы тэхнічнай дапамогі TACIS, адмененае. Судзьдзя Алег Кадач абавязаў падатковую інспэкцыю кампэнсаваць судовыя выдаткі.

Ён далучыў да матэрыялаў справы рашэньне па аналягічнай справе грамадзкага аб'яднаньня "Беларускі Хельсынскі Камітэт", якое, на думку юрыста Асамблеі НДА Юрыя Чавусава, і было пакладзенае ў аснову рашэньня па справе "Волі да разьвіцьця".

23 ліпеня рашэньне Гаспадарчага суда Гарадзенскай вобласьці набыло законную сілу. Слонімская падатковая інспэкцыя адразу заявіла пра свой намер падаць на судовае рашэньне касацыйную скаргу. Але, як нам стала вядома, яна нават не разглядалася, бо пры яе падачы былі дапушчаныя парушэньні. Такім чынам крымінальная справа, узбуджаная супраць кіраўніка арганізацыі "Воля да разьвіцьця" Міхася Варанца, таксама як і ў выпадку са старшынёй БХК, мусіць быць спыненая за адсутнасьцю складу злачынства.

Алёна Андрэева

Фота Андрэя Лянкевіча

Фота Глеба Лабадзенкі

НОВІКАВА АСУДЖАНАЯ ЗА ЛУКАШЭНКУ

Беларуская дысыдэнтка 32-гадовая Аксана Новікава ў чэрвені была асуджаная судом Кастрычніцкага раёну Менску да 2,5 гадоў зьняволеньня. Яна была прызнаная вінаватай у паклёпе на Аляксандра Лукашэнку, што зьмяшчаўся ва ўлётках, якія Новікава раздавала мінакам у сталіцы.

УГОДКІ АКЦЫІ ПРАТЭСТУ

13 чэрвеня ў Менску на плошчы Свабоды сабраліся ўдзельнікі несанкцыянаванай уладамі дэманстрацыі 1984 году. Дваццаць гадоў таму 13 маладых людзей (Вінцук Вячорка, Артур Клінаў, Зьміцер Саўка, Ларыса Сімаковіч ды інш.) адкрыта выступілі ў абарону гістарычнай спадчыны беларускага народу. Яны прадстаўлялі паўлегальную грамадзкую патрыятычную арганізацыю “Майстроўня”.

ГАЛАДОЎКА

Галоўнай палітычнай падзеяй апошніх месяцаў стала 19-дзённая галадоўка групы апазыцыйных палітыкаў — дэпутатаў “Рэспублікі”, сябраў АГП і БНФ. Яны патрабавалі ад Палаты прадстаўнікоў прыняцьця паправак у Закон аб выбарах, якія рабілі б выбарчы працэс больш празрыстым. Палата прагаласавала супраць, але галадоўнікі атрымалі маральную перамогу.

Фота Андрэя Лянкевіча

Фота Глеба Лабадзенкі

ТБМ - 15

27 чэрвеня Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны сьвяткавала сваё пятнаццацігодзьдзе. ТБМ застаецца моцнай і ўплывовай грамадзкай арганізацыяй, зь якой вымушаныя лічыцца нават антыбеларускія ўлады.

ПАЛАТА ДАПАМАГАЕ ДУШЫЦЬ НДА

Палата прадстаўнікоў прыняла ў першым чытаньні папраўкі і зьмены ў Закон "Аб грамадзкіх аб'яднаньнях". Паводле словаў міністра В. Галаванава, яны прыводзяць закон у адпаведнасьць з нормамі Дэкрэту прэзыдэнта краіны № 20 ад 11 верасьня 2003 г. Цяпер усе ГА і саюзы павінны штогод да 1 сакавіка падаваць у органы рэгістрацыі інфармацыю пра свой колькасны склад і праведзеныя мерапрыемствы. Дзейнасьць ГА можа быць прыпыненая на тэрмін да 6 месяцаў паводле рашэньня суду, а ліквідаваць іх цяпер могуць за парушэньне патрабаваньняў у справе выкарыстаньня замежнай дапамогі.

СРОДАК ЗАСТРАШВАНЬНЯ

У Менску прайшла прэзэнтацыя брашуры з вынікамі маніторынгу выкананьня права на справядлівае судовае разьбіральніцтва падчас разгляду справаў аб адміністрацыйных правапарушэньнях. Паводле словаў каардынатара праграмы Юрыя Чавусава, маніторынг ладзіўся ў 12 судах Менску, Берасьця, Віцебску, Наваполацку і Полацку, дзе былі адсочаныя 533 адміністрацыйныя справы. На прэзэнтацыі паведамлялася, што больш за 50% адміністрацыйных справаў у Беларусі разглядаюцца з парушэньнямі. "Адміністрацыйная адказнасьць у Беларусі стала сродкам застрашваньня палітычных апанэнтаў і задавальненьня эканамічных інтарэсаў дзяржавы", - робяць выснову аўтары праведзенага маніторынгу.

МЫ ПАМЯТАЕМ!

7 ліпеня ў Менску прайшла акцыя, прымеркаваная да чацьвертых угодкаў зьнікненьня журналіста Зьмітра Завадзкага. Сотні людзей з партрэтамі Завадзкага ў руках сабраліся на Кастрычніцкай плошчы каля праспэкту Скарыны.

Фота Андрэя Лянкевіча

Фота Раміля Насібуліна

Фота Андрэя Лянкевіча

SAMIZDAT.org

Дзесяць гадоў без свабоды

21 ліпеня ў Менску прайшла акцыя, прымеркаваная да дзесяцігодзьдзя праўленьня А. Лукашэнкі. АМАП і супрацоўнікі спэцслужбаў у гэты дзень затрымалі каля 60 дэманстрантаў, многія зь якіх былі зьбітыя. Ужо на наступны дзень 27 чалавек атрымалі прысуды вялікіх штрафаў (да 50 базавых велічыняў - каля 900 тыс. рублёў) альбо арышту (ад трох да пятнаццаці сутак). Арганізатары - дэпутаты В. Фралоў, Ул. Парфяновіч і С. Скрабец лічаць, што, нягледзячы на рэпрэсіі, акцыя "Твой адказ сыстэме" прайшла пасьпяхова.

Фота www.charter97.org

Мілінкевіч выдаў кнігу

Вядомы грамадзкі дзяяч з Горадні, намесьнік старшыні Фонду садзейнічаньня лякальнаму разьвіцьцю Аляксандар Мілінкевіч выдаў кнігу "Воўчынская гісторыя" (Горадня, 2004), прысьвечаную асобе апошняга караля Рэчы Паспалітай, ураджэнца Беларусі Станіслава Панятоўскага. Кніга надзвычай багата ілюстраваная, а расповед аўтара пра лёс каралеўскага пахаваньня ў беларускай вёсцы Воўчын мае дэтэктыўны сюжэт.

У Беларусь не пусьцілі

Напрыканцы ліпеня ў Беларусь на сустрэчу зь мясцовымі грамадзкімі лідэрамі прыехала кіраўнічка беларускай праграмы польскага Фонду імя Стэфана Баторыя Агнешка Камароўска. Але ў аэрапорце "Менск-2" яна была спыненая беларускімі памежнікамі і на наступны дзень адпраўленая назад, у Варшаву. Аказваецца, спд. Камароўска, якая ўжо неаднойчы наведвала нашую краіну, патрапіла ў лік асобаў, прабываньне якіх у Беларусі "непажаданае".

Угодкі дэклярацыі

27 ліпеня 1990 году Вярхоўным Саветам БССР была прынятая дэклярацыя аб дзяржаўным сувэрэнітэце. Гэта быў адзін зь першых крокаў беларускага парлямэнту да абвяшчэньня незалежнасьці нашай дзяржавы. Раней гэты дзень адзначаўся як дзяржаўнае сьвята Рэспублікі Беларусь.

Падрыхтаваў Сяргей Клімовіч

KAMUNIKAT

FUNDACJA BATOREGO IM.STEFANA

Фота Глеба Лабадзенкі

kamunikat.org

Парфяновіч адбіў атаку чыноўнікаў і генэралаў ... *але ў Грэцыю не паедзе*

Ні для кога не сакрэт, што ў трэцім сэктары склаўся стэрэатып наконт падкантрольнасьці ўладам спартовых НДА Беларусі (каля 20% усіх грамадзкіх аб'яднаньняў краіны). Гэтаму спрыяе прыход на кіраўнічыя пасады ў спартовыя фэдэрацыі палкоўнікаў, генэралаў спэцслужбаў і чыноўнікаў на чале з А. Лукашэнкам, які ўзначальвае ГА "Нацыянальны алімпійскі камітэт". Але падзеі цяперашняга лета могуць зблытаць усе карты ў "спартовай палітыцы" ўладаў. У шэрагі апазыцыі стаў вядомы беларускі спартовец, трохразовы алімпійскі чэмпіён, кіраўнік фэдэрацыі веславаньня і дэпутат Палаты прадстаўнікоў Уладзімер Парфяновіч. Спробы міністра спорту генэрала Ю. Сівакова і кампаніі вывесьці Парфяновіча са складу НАКу праваліліся, бо былі нэгатыўна сустрэтыя спартовай грамадзкасьцю. Лукашэнка пабаяўся бунту спартоўцаў напярэдадні Алімпійскіх гульняў. Сёньня Ўл. Парфяновіч адказвае на пытаньні карэспандэнта "Асамблеі".

- Спадар Уладзімер, ходзяць чуткі, што спартовыя грамадзкія арганізацыі знаходзяцца пад уплывам спэцслужбаў...

- Пра гэта я нічога ня ведаю, але пра сваіх калегаў магу сказаць: Генадзь Нявыглас (кіраўнік Рады бясьпекі. - Рэд.) узначальвае фэдэрацыю футболу, Уладзімер Навумаў (міністар унутраных справаў. - Рэд.) - фэдэрацыю хакею, Аляксандар Шпілеўскі (старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэту. - Рэд.) - фэдэрацыю цяжкай атлетыкі, старшыня КДБ Леанід Ерын - фэдэрацыю біятлону, мэр Менску Паўлаў - фэдэрацыю тэнісу. Колькі яшчэ "генэралаў" трэба ў Беларусі? У спорце ўсе разьбіраюцца незалежна ад званьня і ўдзелу ў ім.

- Выканкам Нацыянальнага алімпійскага камітэту рэкамэндаваў Алімпійскаму сходу выключыць Вас з НАКу. Вы нібыта "нанесьлі маральную шкоду алімпійскаму руху і прынцыпам алімпізму". Чым гэта абумоўлена?

- Яны гэта абгрунтавалі тым, што я нібыта парушыў статут Нацыянальнага алімпійскага камітэту і дыскрэдытаваў НАК. Што грамадзкая арганізацыя - Алімпійскі фонд, які я ўзначальваў, - ня выканала сваіх задачаў. Я мяркую, што фонд выконваў свае функцыянальныя абавязкі да пэўнага моманту, калі Алімпійскі камітэт як грамадзкая арганізацыя прыняў рашэньне аб стварэньні сваіх прадстаўніцтваў у абласьцях. Пасьля гэтага камітэт цалкам узяў усе функцыі фонду, і той застаўся не пры справах. Мы паспрабавалі яшчэ трохі папрацаваць, але, як любая НДА, ня мелі права займацца гаспадарчай дзейнасьцю, і сродкаў для існаваньня ў нас не было. Тое, што мы прыносілі ў спартовую скарбонку, адразу ж перадавалі Алімпійскаму камітэту: 10 кватэраў, нешта

Фота Глеба Лабадзенкі

каля 70 тысяч даляраў - усё для спартоўцаў і разьвіцьця спорту. Але ніхто належным чынам не ацаніў гэтую нашу дзейнасьць.

Фармальна фонд быў закрыты Вярхоўным судом у 2003 годзе па скарзе Мінюста з прычыны не такіх, як трэба, двукосьсяў на пячатцы менскай арганізацыі і праз тое, што не паведамілі своечасова пра наш пераезд. Пра гэтыя парушэньні ніхто ня кажа, але нас за гэта закрылі. Я лічу, што былі проста "паддывановыя гульні". Уявіце, што памочнік прэзыдэнта па спорце і супрацоўнік НАК Ананьеў (нядаўна ён склаў свае паўнамоцтвы. - Рэд.) піша ліст, дзе рэкамэндуе закрыць Менскі алімпійскі фонд. Гэта значыць, што адна НДА рэкамэндуе іншай закрыцца!

- Цяпер мінулагоднее закрыцьцё фонду выкарыстоўваюць як падставу для Вашага выключэньня з камітэту?

- Відаць, Парфяновіч стаў фігурай, якую трэба рэзаць па розных напрамках. Ну, і ня могуць мне дараваць, што я сказаў пра 14 магчымых мэдалёў на Алімпійскіх гульнях, а ня 25, паводле афіцыйнай пазыцыі кіраўніцтва краіны. Гэта маё меркаваньне. Я, вядома, за тое, каб беларускія спартоўцы заваявалі 25-30 мэдалёў. Але, паводле маіх падлікаў, іх будзе 14. Вось гэта нібыта і ёсьць "дыскрэдытацыяй Алімпійскага камітэту". А калі атрымаецца, што і гэтых 14 не заваююць, - што тады?

- Вінаватым у гэтым правале могуць назваць Парфяновіча...

- Я згодны з тым, што мы павінны рухацца наперад. Але, заяўляючы пра нерэальныя пляны, чыноўнікі не падумалі пра іншыя палітычныя матывы. Калі маленькая Беларусь зь дзесяцьцю мільёнамі насельніцтва заяўляе пра заваёву дваццаці пяці мэдалёў, прадстаўнікі спорту і чыноўнікі іншых краінаў проста папросяць больш строга праверыць беларусаў, быць больш строгімі ў судзействе, лішні раз узяць аналізы на допінг. Спорт - гэта вялікая гульня, і трэба імкнуцца не нашкодзіць. Пляны трэба будаваць, але ня так, як на трактарным заводзе.

- Што было для Вас як спартоўца тым галоўным, што дапамагала перамагчы?

- Самае галоўнае - гэта любоў да Радзімы. Кожны павінен любіць сваю Радзіму. А ў нас пакрысе пачынаюць падмяняцца паняцьці: калі ты ня любіш прэзыдэнта - быццам ты ня любіш Радзіму. Гэта адно з другім ніяк не зьвязана: сёньня ў краіне адзін прэзыдэнт, заўтра - іншы. У спартоўца павінна быць любоў да Радзімы, да сваіх людзей, якія далі табе магчымасьць выехаць на гэтыя спаборніцтвы.

- А ці паедзеце Вы на Алімпійскія гульні ў Грэцыю?

- Не, натуральна. На заробак дэпутата туды не паедзеш...

Вольга Мікалайчык

Эфэкт Франкенштэйна

Яшчэ ў першым нумары нашага часопісу вясной 2003 г. мы паведамлялі пра спробы Беларускага саюзу моладзевых і дзіцячых грамадзкіх аб'яднаньняў "Рада" здабыць прыхільнасьць прэзыдэнта краіны, які быццам быў "дрэнна інфармаваны" пра яе дзейнасьць. Яму быў напісаны ліст, у спадзяваньні, што ўдасца "выправіць сытуацыю". Не ўдалося. Цяпер "Рада", як відаць з дасланага ў рэдакцыю тэксту, на прэзыдэнта ўжо не спадзяецца. Між тым актыўныя спробы ўладаў узяць пад свой кантроль моладзевы рух ужо даўно хвалююць незалежнае беларускае грамадзтва. І ня проста хвалююць, але і выклікаюць супраціў з боку моладзевых НДА, многія зь якіх стараньнямі чыноўнікаў страцілі сваю легальнасьць альбо вымушаныя працаваць падпольна ад самага ўтварэньня. Цяпер вось і "Рада" нарэшце зразумела, што з гэтай уладай дамовіцца немагчыма, што ёй патрэбныя толькі "свае" моладзевыя арганізацыі, цалкам падкантрольныя і ляяльныя.

У афіцыйнай моладзевай палітыцы Рэспублікі Беларусь у цяперашні час назіраецца зацяжны крызыс. У яе полі дзейнічаюць два афіцыйныя гульцы: Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі (БРСМ) і Беларускі саюз моладзевых і дзіцячых грамадзкіх аб'яднаньняў "Рада" (БСМДГА "Рада"). Першы гулец — БРСМ - гэта моладзевая арганізацыя, якая мае наўпроставую падтрымку прэзыдэнта Беларусі і, як вынік, валодае неабмежаванымі палітычнымі, адміністрацыйнымі і фінансавымі рэсурсамі. Другі гулец — "Рада" на сёньняшні дзень мае адзіны козыр - сам факт яго легальнага існаваньня.

Падзеі на гульнёвым полі зьмяняюцца са звышнатуральнай хуткасьцю. Да 2002 г. у моладзевай палітыцы Беларусі існавалі некалькі рэальна дзейных сілаў: з аднаго боку, адкрыта прапрэзыдэнцкая арганізацыя - Беларускі патрыятычны саюз моладзі (БПСМ), зь іншага - усе астатнія моладзевыя рухі і арганізацыі. Паміж імі апынуўся Камітэт па справах моладзі - орган дзяржкіраваньня, які рэгуляваў дзяржаўную моладзевую палітыку і спрабаваў быць нэўтральным у адносінах да ўсіх моладзевых арганізацыяў. Такая ж нэўтральная і "Рада", нягледзячы на наяўнасьць у яе складзе часткі апазыцыйных моладзевых арганізацыяў. Гэты "трыножнік" трымаў раўнавагу ў моладзевай палітыцы Беларусі, пакуль кімсьці не было прынятае рашэньне рэарганізаваць (у бок аслабленьня) Камітэт па справах моладзі, які існаваў пры Савеце Міністраў. Замест яго быў створаны Дэпартамэнт па справах моладзі Міністэрства адукацыі. З гэтага моманту раўнавага была парушаная.

Пасьля рэарганізацыі Камітэту па справах моладзі адбыўся яшчэ адзін "ход канём". Каб схаваць фінансавыя непаразуменьні недзеяздольнага БПСМ (дарэчы, выяўленыя пасьля праверкі арганізацыі Міністэрствам фінансаў), які скампрамэтаваў сябе ня толькі ў моладзевых колах, быў распачаты працэс яго аб'яднаньня зь Беларускім саюзам моладзі (БСМ) - дастаткова пасьпяховым, большым паводле колькаснага складу, што атрымаў у спадчыну ад савецкага камсамолу маёмасьць і адмовіўся ад камсамольскай ідэалёгіі. У верасьні 2003 г. гэтае аб'яднаньне адбылося, і новае ўтварэньне назвалі "Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі". Ён працягнуў дзейнасьць, якой займаўся і пад шыльдай БПСМ: прапагандаваў "адзіна правільную прэзыдэнцкую ідэалёгію", вэрбаваў сябраў, здабываў сродкі для бязьбеднага існаваньня свайго кіраўніцтва ў розных міністэрствах і ведамствах. Гэтую пазыцыю замацаваў Указ прэзыдэнта Беларусі № 16 "Аб дзяржаўнай падтрымцы грамадзкага аб'яднаньня "Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі", дзе разьвіцьцё моладзевага руху ў Рэспубліцы Беларусь атаясамліваецца з "аказаньнем садзейнічаньня грамадзкаму аб'яднаньню "Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі". Палажэньні гэтага ўказу замацоўваюць на дзяржаўным узроўні выключную ролю вышэйназванага аб'яднаньня ў працы з моладзьдзю: асобны артыкул у дзяржаўным бюджэце для фінансаваньня, увядзеньне сябраў кіраўнічых органаў у склад калегіяў шэрагу міністэрстваў. Гэтыя факты сьведчаць пра ўрадавы характар ГА "БРСМ". Па сутнасьці, гэта тыповая дзяржаўная арганізацыя, працаўнікі якой зьяўляюцца дзяржслужбоўцамі паводле ўзроўню заробку і наяўных ільготаў.

Паводле прынцыпу стварэньня БРСМ зьявіўся нашчадкам абодвух яго папярэднікаў: нёс адказнасьць па падпісаных дамовах, абавязацельствах, пазыках і г. д. У тым ліку і па сяброўстве ў БСМДГА "Рада", бо Беларускі саюз моладзі зьяўляўся заснавальнікам і поўным сябрам Саюзу. У арганізацыяў - сябраў "Рады" практычна не было выбару ў прыняцьці рашэньня аб сяброўстве новаўтворанай арганізацыі ў Саюзе: паводле беларускага заканадаўства дадзеная арганізацыя аўтаматычна станавілася поўным сябрам "Рады". Пры гэтым БРСМ у пісьмовай форме пацьвердзіў сваё сяброўства ў "Радзе", прадстаўнік гэтай арганізацыі актыўна лабіяваў гэтае пытаньне на сходах арганізацыяў-сябраў. Тым ня менш, на адным са сходаў прадстаўнікоў БСМДГА "Рада" было праведзена галасаваньне аб сяброўстве БРСМ, і сход прагала-

саваў з роўнай колькасьцю галасоў "за" і "супраць". Інтарэс БРСМ да "Рады" быў невыпадковы, бо ў пэрыяд з 2002 г. да 2003 году пачынае павялічвацца ўплыў БСМДГА "Рада" на моладзевую палітыку. БСМДГА "Рада" наладжвае інфармацыйнае ўзаемадзеяньне з усімі дзейнымі моладзевымі арганізацыямі і ініцыятывамі, пашырае сваю дзейнасьць на ўсю тэрыторыю Рэспублікі Беларусь, праводзіць сумесныя мерапрыемствы зь дзяржструктурамі, зьдзяйсьняе дамоўленасьці пра ўзаемадзеяньне моладзевых і дзіцячых аб'яднаньняў з органамі мясцовай улады, распрацоўвае ініцыятыву зьмяненьня дзейных нарматыўна-заканадаўчых актаў на карысьць моладзевых арганізацыяў. Здавалася б, ну вось, нарэшце, пачынаецца хоць нейкі дыялёг і ўзгадненьне пазыцыяў. Відаць, актыўная дзейнасьць "Рады" патрапіла ў поле зроку ня толькі тагачаснага кіраўніцтва БРСМ, але і прэзыдэнта Беларусі. І неўзабаве зьявіліся хмары. У адным са сваіх выступаў А. Лукашэнка назваў БСМДГА "Рада" "дзіравым парасонам" і выказаў зьдзіўленьне наконт таго, што БРСМ "зьбіраецца кудысьці там уступаць". Складана сказаць, з чыёй падачы была зроблена такая радыкальная заява наконт "Рады", аднак з гэтага моманту і пачала разьвівацца сытуацыя, якая ўкараніла існы крызыс. Пасьля гэтай заявы прэзыдэнта рэзка спынілася афіцыйнае ўзаемадзеяньне Саюзу з Дэпартамэнтам па моладзевай палітыцы, стала вельмі складана зьдзяйсьняць сумесную дзейнасьць зь іншымі дзяржаўнымі структурамі. Было зьменена кіраўніцтва БРСМ, пасьля чаго ён вельмі хутка адхрысьціўся ад сяброўства ў "Радзе" і стаў актыўна займацца сваёй бягучай дзейнасьцю. Але на гэтым адыёзнае шэсьце гэтай арганізацыі ня скончылася. Яна вырашыла заваяваць яшчэ адну пазыцыю - заснавальніка і фактычнага ідэоляга новага, "правільнага" саюзу моладзевых арганізацыяў. Відаць, іх вельмі ўразіў непрацяглы досьвед сяброўства ў БСМДГА "Рада".

Фота Глеба Лабадзенкі

Сутнасьць моладзевай палітыкі сёньняшніх уладаў - вяртаньне ў савецкае мінулае

Стварэньне новага саюзу было ахутана глыбокай тайнай. На ўстаноўчы зьезд, які адбыўся 24 кастрычніка 2003 г., выбарачна запрасілі нават у якасьці назіральнікаў толькі праверaныя і паслухмяныя арганізацыі. Большасьць незалежных арганізацыяў інфармацыю пра стварэньне новага саюзу атрымалі пасьля ўстаноўчага зьезду. Новую арганізацыю назвалі Рэспубліканскім саюзам грамадзкіх аб'яднаньняў "Беларускі камітэт моладзевых арганізацыяў", які аб'яднаў 29 арганізацыяў. Не сакрэт, што гэтая арганізацыя створана пад патранажам БРСМ і ў якасьці альтэрнатывы ўжо існай Нацыянальнай Радзе. Структура "двайніка" неаднародная, у яе ўваходзяць ня толькі моладзевыя арганізацыі, але таксама фонды і ня моладзевыя арганізацыі. Такая неаднародная структура супярэчыць нормам беларускага заканадаўства, што яшчэ раз пацьвярджае выключны статус новага саюзу. У склад вышэйназванага саюзу ўвайшоў шэраг арганізацыяў, якія зьяўляліся сябрамі БСМДГА "Рада": ГА "Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя", дзіцячая грамадзкая арганізацыя "Беларуская рэспубліканская скаўцкая асацыяцыя", ГА "Беларуская ліга інтэлектуальных камандаў", дзіцячае ГА "Асацыяцыя беларускіх гайдаў", рэспубліканскае ГА "Беларускі КВЗ". Гэта пераважна тыя арганізацыі, якія атрымліваюць фінансаваньне для сваіх праектаў зь дзяржаўных фондаў. Маюцца факты

MUNKAT.org

ціску на арганізацыі - сябры БСМДГА "Рада": іх прымушаюць выходзіць зь яе складу і ўступаць у новы саюз, пагражаючы паставіць пад пытаньне легітымнасьць іх дзейнасьці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. За амаль гадавое існаваньне дадзеная структура ніяк не абазначыла сябе канкрэтнымі мерапрыемствамі. Толькі па афіцыйным беларускім радыё не аднойчы гучалі інтэрвію зь яе старшынём, які энэргічна распавядаў пра грандыёзныя пляны.

Навошта трэба было ствараць новы саюз пры наяўнасьці старога, працэдура ўступленьня ў які была простай і празрыстай? Дакладна не для таго, каб узмацніць уплыў іншых арганізацыяў на фармаваньне моладзевай палітыкі на нацыянальным узроўні. БРСМ, дзякуючы палітычнай падтрымцы кіраўніка дзяржавы, быў і застаецца самай уплывовай дзяржаўна-грамадзкай арганізацыяй. Хутчэй за ўсё, новы саюз будзе спрабаваць выйсьці на міжнародны ўзровень і прабіць замежны кардон. Пакуль БРСМ гэта ўдаецца зь вялікімі цяжкасьцямі. Асноўнымі яго партнэрамі зьяўляюцца арганізацыі постсавецкіх краінаў, найчасьцей расейскія, а большасьць НДА краінаў Эўропы і ЗША адхрышчваюцца ад сяброўства з манапалістам беларускага моладзевага руху.

Іншыя ж "непаслухмяныя" арганізацыі можна закрыць, а "Рада" самаліквідуецца: няма арганізацыяў-сябраў - няма і саюзу. Тэндэнцыі ў моладзевай палітыцы яўна сьведчаць аб прыняцьці такой стратэгіі. Увесь час узмацняецца ціск на моладзевыя арганізацыі з боку Міністэрства юстыцыі: усе (!) незалежныя НДА падпалі пад пільныя праверкі. За апошнія паўгоду з даволі фармальных прычынаў рашэньнем Вярхоўнага суду Беларусі былі ліквідаваныя наступныя грамадзкія аб'яднаньні - сябры БСМДГА "Рада": ГА "Маладая грамада", рэспубліканскае грамадзкае аб'яднаньне "Беларускае аб'яднаньне маладых палітыкаў" і моладзевае грамадзкае аб'яднаньне "Новая група". Прыклад "Новай групы" паказвае, што пачалася ліквідацыя палітычна нэўтральных арганізацыяў. Усе "непаслухмяныя" НДА знаходзяцца ў вельмі нестабільнай сытуацыі. Закрыта можа быць ЛЮБАЯ арганізацыя, таму што фармальную прычыну для ліквідацыі знайсьці можна заўсёды.

"Паслухмяныя" арганізацыі цешаць сябе ілюзіямі наконт таго, што іх паслухмянасьць дае ім індульгенцыю супраць закрыцьця. Але так ня будзе. Як толькі яны хоць у чым-небудзь стануць канкурэнтамі БРСМ, як толькі праявяць хоць нейкую пазыцыю, якая ня будзе супадаць з афіцыйнай, яны будуць ліквідаваная настолькі хутка, што нават не пасьпеюць здагадацца, чым менавіта не дагадзілі ўладам.

На існую сытуацыю паўплываць практычна немагчыма, паколькі ў моладзевай палітыцы ў Беларусі адсутнічаюць ня толькі мэханізмы, з дапамогай якіх можна наладжваць канструктыўны дыялёг зь дзяржавай, але таксама і мэханізмы абароны сваіх правоў. Указам прэзыдэнта Беларусі Дэпартамэнт па справах моладзі ў тэрмін да 1 чэрвеня 2004 г. быў рэарганізаваны шляхам далучэньня да Міністэрства адукацыі.

Высновы нескладаныя. У сфэры дзяржаўнай моладзевай палітыкі Рэспублікі Беларусь устаноўлена манаполія з боку грамадзка-дзяржаўнай арганізацыі БРСМ. Прэсынг з боку дзяржавы на незалежныя грамадзкія аб'яднаньні прывядзе да таго, што многія моладзевыя арганізацыі альбо спыняць сваё існаваньне, альбо сыйдуць "у андэрграўнд".

Зыходзячы з вышэйвыкладзеных фактаў, БСМДГА "Рада" ацэньвае існы крызыс у моладзевай палітыцы як штучна створаны палітыкай беларускай дзяржавы, паколькі яго прычыны заключаюцца ня ў крызысе разьвіцьця моладзевых НДА, а ў тым, што іх зьнішчаюць, замяняючы недзеяздольнымі "зомбі". Такім чынам, у моладзевай палітыцы Беларусі спрацоўвае "эфэкт Франкенштэйна". Зь цяжкасьцю ажылае "нешта" пасьпяхова палохае ўсіх, хто ня хоча "сябраваць". А між тым у Беларусі ўжо сфармаваўся попыт на існаваньне больш чым дзьвюх моладзевых арганізацыяў. Гэта - выбар беларускай моладзі, які павінны забясьпечваць і моладзевыя грамадзкія аб'яднаньні, і дзяржаўныя структуры. Цяпер жа пра гэта турбуюцца зарэгістраваныя моладзевыя арганізацыі, забясьпечваючы альтэрнатыву БРСМ і захоўваючы для моладзі легальную прастору для грамадзкай актыўнасьці, чаго ня могуць забясьпечыць незарэгістраваныя моладзевыя аб'яднаньні.

Зарэгістраваныя моладзевыя арганізацыі працуюць, ажыцьцяўляюць вельмі важныя сацыяльна значныя праекты, нягледзячы на тое, што менавіта на іх накіраваныя стрэлы Міністэрства юстыцыі, што яны знаходзяцца пад жорсткім фінансавым і палітычным кантролем. Менавіта ў іх забіраюць і прысвойваюць сабе ідэі актывісты БРСМ, менавіта яны, не атрымліваючы цяпер нават маральнай падтрымкі ад дзяржавы, спрабуюць працаваць легальна і паводле закону. Навошта ім гэта трэба? Гэта не палітычная наіўнасьць, а хутчэй прынцыповая пазыцыя лідэраў арганізацыяў. Паводле трапнага выразу старшыні МГА "Новыя твары" Алены Касько, "разнастайнасьць відаў каштоўная ня толькі ў батаніцы, але і ў моладзевай палітыцы. Немагчыма добраахвотна аб'яднаць усю моладзь у адну альбо дзьве арганізацыі. Манаполія НДА неэфэктыўная і недэмакратычная".

БСМДГА "Рада" лічыць, што неабходна падтрымліваць і абараняць інтарэсы найперш зарэгістраваных НДА, паколькі толькі яны ў існай сытуацыі могуць прапанаваць моладзі рэальную *легальную* альтэрнатыву ўдзелу ў грамадзкім жыцьці краіны. Менавіта іх наяўнасьць у грамадзкім жыцьці паказвае, дзе жывы арганізм, а дзе Франкенштэйн, дзе рэальная дзейнасьць, а дзе яе млявая імітацыя.

Яніна Зінчанка, старшыня Прэзыдыюму БСМДГА "Рада"

Вольга Сацук, кансультант па сувязях з грамадзкасьцю БСМДГА "Рада"

Плённы старт новай Рабочай групы

пачатак на ст.2

Міжнароднай асацыяцыі атрымаюць штосьці накшталт "сэртыфікату прызнаньня" і будуць мець некаторыя іншыя атрыбуты.

Стварэньне такой асацыяцыі дазволіць легалізаваць у Эўропе тыя няўрадавыя арганізацыі, якія з розных прычынаў былі забароненыя альбо якім пагражае забарона ў Беларусі".

Таксама была прынятая за аснову ***канцэпцыя Фонду ўзаемадапамогі***, за стварэньне якога галасавалі дэлегаты Кангрэсу. Нагадаем, што асноўны сэнс стварэньня Фонду ў тым, каб мець магчымасьць дапамагаць грамадзкім актывістам, якія перасьледуюцца ўладамі, якіх пазбаўляюць працы і г. д. Падчас абмеркаваньня канцэпцыі Фонду і рабочага пляну яго стварэньня паўстала важнае, на думку кожнага з прысутных, пытаньне: каго ж лічыць пацярпелым? Паводле якіх крытэраў вызначаць тых, каму патрэбная дапамога? Выказваліся і некаторыя заўвагі да канцэпцыі. Таму распрацоўшчыкам было прапанавана дапрацаваць канцэпцыю з улікам прапановаў сябраў РГ і падаць яе на наступным пасяджэньні разам з рабочым плянам.

Быў абмеркаваны і зацьверджаны рабочы плян ***удасканаленьня сыстэмы калектыўнай абароны***. Нагадаем, што цяпер у межах сыстэмы ў кожнай вобласьці працуюць юрысты, якія аказваюць бясплатную юрыдычную дапамогу НДА, праводзіцца навучаньне для актывістаў па прававых аспэктах дзейнасьці грамадзкіх арганізацыяў, выдаюцца дапаможныя брашуры. Сярод заплянаваных мерапрыемстваў па ўдасканаленьні сыстэмы калектыўнай абароны - правядзеньне круглага стала зь юрыстамі і прадстаўнікамі НДА з мэтай выяўленьня патрэбаў тых, хто мае намер займацца пытаньнямі абароны НДА, арганізацыя агульнай інфармацыйнай прасторы паміж юрыстамі з мэтай абмену досьведам, правядзеньне шэрагу адукацыйных мерапрыемстваў і выданьне дапаможных матэрыялаў.



Падчас пасяджэньня Рабочай групы
Фота Алёны Андрэевай

Таксама ў першы дзень былі разгледжаныя напрацоўкі **галіновых круглых сталоў** ад 1-2 траўня. На іх падставе былі складзеныя прыблізныя рабочыя пляны ў васьмі галінах дзейнасьці, прадстаўнікі якіх зьяўляюцца сябрамі РГ: сацыяльнай, праваабарончай, моладзевай, жаночай, экалягічнай, культурніцка-краязнаўчай, адукацыйнай і рэсурсавых цэнтраў. Па многіх напрамках пляны патрабуюць грунтоўнай дапрацоўкі. Яны будуць выносіцца на канчатковае зацьвярджэньне РГ пазьней. Але сябрам Рабочай групы было даручана дапрацаваць рабочыя пляны і распрацаваць мэханізм прыцягненьня да іх выкананьня ўсіх зацікаўленых арганізацыяў.

Так, напрыклад, сябрамі РГ ад ***адукацыйных*** НДА былі вызначаныя асноўныя прыярытэты іх працы ў межах галіны дзейнасьці. Сярод іх навучаньне беларускіх НДА асновам арганізацыйнага разьвіцьця, праца па падрыхтоўцы і лабіяваньні закону аб адукацыі дарослых, які пакуль адсутнічае ў Беларусі, абарона і прасоўваньне беларускай мовы ў адукацыі, а таксама стварэньне агульнай інфармацыйнай і камунікатыўнай прасторы для адукацыйных НДА.

"Праца ў некаторых кірунках ужо вядзецца, - кажа сябра Рабочай групы Асамблеі ад адукацыйных НДА **Ўлад Вялічка**. - Ужо цяпер рыхтуецца шэраг мерапрыемстваў і праектаў, накіраваных на рэалізацыю шырокай праграмы па арганізацыйным разьвіцьці для сябраў Асамблеі. Асабіста я ўваходжу ў склад творчай групы, якая займаецца рэалізацыяй дзейнасьці ў межах стратэгічнай мэты "Стварэньне ўмоваў для арганізацыйнага разьвіцьця сябраў Асамблеі". Таксама рыхтуюцца да выхаду другі і трэці нумары часопісу "Адукатар", якія будуць прысьвечаныя тэмам "Адукацыя дарослых" і "Ўстойлівае разьвіцьцё". Да таго ж, Асацыяцыяй грамадзянскай адукацыі рыхтуецца праект, накіраваны на большасьць беларускіх адукацыйных і асьветніцкіх НДА Беларусі, з мэтай арганізаваць агульную прастору для абмену досьведам, камунікацыі, павышэньня кваліфікацыі, мэтадычных распрацовак і г. д".

Пра тое, што напрацавалі сябры Рабочай групы, абраныя ад ***сацыяльных*** арганізацыяў, нам распавёў **Анатоль Гурыновіч**: "Нягледзячы на разнастайнасьць кірункаў дзейнасьці сацыяльных НДА, удзельнікі выпрацавалі агульную ідэю нацыянальнай праграмы, якая магла б аб'яднаць намаганьні сацыяльных НДА ў працы са сваімі мэтавымі групамі.

На пасяджэньні Рабочай групы працягвалася праца ў кірунку, вызначаным на Кангрэсе. Варта нагадаць, што тады ў межах галоўных кірункаў праграмнай дзейнасьці было прызнана неабходным правядзеньне штогадовага конкурсу "Лепшы сацыяльны пра-

ект", а таксама рэалізацыя праграмаў "Сям'я і дзеці" і "Экалёгія жыльля".

Сябры Рабочай групы ўдакладнілі неабходныя крокі для правядзеньня конкурсу "Лепшы сацыяльны праект". Плянуецца стварыць групу для распрацоўкі канцэпцыі конкурсу паводле ідэяў, якія прагучалі на круглым стале сацыяльных НДА. Мяркуецца, што круглы стол пройдзе ў лістападзе - сьнежні. Пасьля рассылкі запрашэньняў да ўдзелу ў конкурсе будзе створана незалежная група экспэртаў, якая і зойменца ацэнкай праектаў. Пераможцы атрымаюць узнагароды. Вынікі конкурсу будуць абмяркоўвацца і на пасяджэньні Рабочай групы.

Таксама працягваецца праца над дэталёвай распрацоўкай праграмаў "Сям'я і дзеці" і "Экалёгія жыльля".

Акрамя таго, у рамках выкананьня сацыяльных праграмаў зьяўляецца неабходным стварэньне Інфармацыйнага цэнтру сацыяльнай дапамогі, які стане крыніцай інфармацыі аб мерапрыемствах усіх НДА сацыяльнай сфэры - ад дапамогі інвалідам да адпачынку дзяцей.

І яшчэ. Плянуецца перарэгістрацыя НДА ў межах Асамблеі. У самым пачатку я ўжо казаў пра разнастайнасьць кірункаў дзейнасьці сацыяльных НДА. Каб сацыяльны кірунак у дзейнасьці Асамблеі стаў больш значным, нам неабходна мець больш падрабязную інфармацыю. І было б вельмі добра, калі б кіраўніцтва арганізацыяў больш дакладна пералічыла прыярытэты дзейнасьці сваіх НДА, канкрэтызавала від сацыяльнай дзейнасьці".

Людміла Кокаш распавяла пра тое, што напрацавалі сябры Рабочай групы, абраныя ад **жаночых** арганізацыяў: "Нашая група зазначыла, што жаночыя арганізацыі маглі б прыняць больш актыўны ўдзел у падрыхтоўцы чарговага альтэрнатыўнага дакладу ў камітэт CEDAW.

У студзені 2004 г. на 30-й сэсіі Камітэту па Жаночай канвэнцыі ААН урад Рэспублікі Беларусі даваў справаздачу пра выкананьне канвэнцыі аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын. У Камітэт па Жаночай канвэнцыі быў пададзены даклад за пэрыяд 1994—2000 гг. Дзьве жаночыя арганізацыі — ГА "Жаночы незалежны дэмакратычны рух" і "Асацыяцыя маладых хрысьціянскіх жанчын" — паралельна ініцыявалі ўкладаньне альтэрнатыўнай справаздачы. Гэтыя арганізацыі правялі шырокую кампанію з мэтай прыцягненьня жаночых і праваабарончых арганізацыяў у працэс падрыхтоўкі дакладу і распаўсюду інфармацыі. Нашая група вырашыла, што добра было б, каб жаночыя арганізацыі, якія ўваходзяць у Асамблею НДА Беларусі, прынялі актыўны ўдзел у падрыхтоўцы чарговага альтэрнатыўнага дакладу ў камітэт CEDAW. Паколькі самі жаночыя арганізацыі не заўсёды дастаткова інфармаваны аб Жаночай канвэнцыі ААН, асновай працы павінны стаць адукацыйныя сэмінары ва ўсіх абласьцях краіны і адзін сэмінар у Менску. Паводле іх вынікаў вызначацца канкрэтныя арганізацыі, якія будуць удзельнічаць у далейшай працы па ўкладаньні альтэрнатыўнай справаздачы.

Наступны блёк праграмы — правядзеньне ў абласьцях і ў сталіцы сэмінараў дзеля распрацоўкі варыянтаў каардынацыі паміж удзельнікамі (гэта можа быць сетка жаночых арганізацыяў) у падрыхтоўцы дакладу. Далей будзе правядзеньне "круглага стала" дзеля прэзэнтацыі праграмы з удзелам жаночых і праваабарончых арганізацыяў, прадстаўнікоў органаў улады і мас-мэдыя. На "круглым стале" могуць вызначыцца крытычныя сфэры для альтэрнатыўнай справаздачы. Да наступнага паседжаньня РГ будзе падрыхтаваны сьпіс жаночых арганізацыяў — патэнцыйных удзельнікаў кампаніі складаньня альтэрнатыўнай справаздачы ў Камітэт CEDAW. На сеньняшні дзень ужо пачаўся пошук фінансаваньня мерапрыемстваў нашай праграмы".

У другі дзень працы на разгляд РГ былі вынесеныя рабочыя пляны ў двух астатніх стратэгічных напрамках дзейнасьці Асамблеі: **"Удасканаленьне формаў і мэтадаў камунікацыі паміж сябрамі Асамблеі і зьнешнім асяродзьдзем"** і **"Маніторынг, аналіз і ацэнка дзейнасьці грамадзкага сэктару"**. Нагадаем, што мэтамі стратэгічнага кірунку "Ўдасканаленьне формаў і мэтадаў камунікацыі паміж сябрамі Асамблеі і зьнешнім асяродзьдзем" зьяўляюцца: паляпшэньне іміджу НДА ў грамадзтве, стварэньне ўмоваў для арганізацыйнага разьвіцьця сябраў Асамблеі, пашырэньне прысутнасьці НДА ў інфармацыйнай прасторы і ўвядзеньне ў практыку шырокага абмеркаваньня актуальных для грамадзтва і НДА праблемаў і шляхоў іх вырашэньня.

Рабочыя пляны ў паляпшэньні іміджу НДА ў грамадзтве і пашырэньні прысутнасьці НДА ў інфармацыйнай прасторы прэзэнтаваў намесьнік старшыні Рабочай групы Вацлаў Арэшка.

У межах стратэгічнай мэты ***ў паляпшэньні іміджу НДА*** запланавана правесьці круглы стол "Грамадзкія кампаніі як форма дзейнасьці. Мадэлі кампаніяў", арганізаваць навучаньне сябраў Асамблеі па грамадзкіх сувязях, зладзіць маніторынг СМІ на прадмет іміджу НДА і інш. Рабочы плян па гэтай мэце было вырашана дапрацаваць згодна з унесенымі сябрамі РГ прапановамі.

У межах стратэгічный мэты ***"Пашырэньне прысутнасьці НДА ў інфармацыйнай прасторы"*** былі запланаваныя мерапрыемствы дзеля ўдасканаленьня сыстэмы распаўсюду інфармацыі праз рассылкі Выканаўчага бюро, сайт, часопіс "Асамблея", непасрэдную працу з журналістамі.

Нагадаем, што дэлегаты V Кангрэсу Асамблеі даручылі новай Рабочай групе дапрацаваць задачы па стратэгічнай мэце ***"Стварэньне ўмоваў для арганізацыйнага разьвіцьця сябраў Асамблеі"***. Адказнай за гэтую працу стала намесьніца старшыні Рабочай групы Ірына Жыхар. На пасяджэньні РГ спн. Ірына прэзэнтавала ўжо дапрацаваныя задачы і рабочы плян іх рэалізацыі. Яна распавяла пра запланаваную і ўжо зробленую працу. Пра гэта чытайце ў матэрыяле "Мы павінны стварыць умовы для разьвіцьця арганізацыйнай культуры" на ст. 27.

Віталь Васількоў, намесьнік старшыні Рабочай групы, прэзэнтаваў рабочы плян у стратэгічным кірунку ***"Маніторынг, аналіз і ацэнка дзейнасьці грамадзкага сэктару"***. Сп. Віталь распавёў пра заплянаваную працу: "Аналітычная інфармацыя пра стан грамадзкага сэктару зьяўляецца на сёньняшні дзень неабходнай для павышэньня эфэктыўнасьці працы НДА. Функцыянаваньне сыстэмы маніторынгу, аналізу і ацэнкі дзейнасьці грамадзкага сэктару дазволіць арганізацыям аб'ектыўна ацэньваць сваю працу, карэктаваць дзейнасьць згодна з рэчаіснасьцю, якую не заўсёды аб'ектыўна ацэньваюць самі арганізацыі.

На першым этапе рэалізацыі рабочага пляну ў маніторынгу, аналізе і ацэнцы плянуецца правядзеньне, так бы мовіць, устаноўчай канфэрэнцыі. На ёй будуць абмеркаваныя мэты і задачы штогадовага маніторынгу і аналізу патрэбаў НДА - сябраў Асамблеі, крытэры і стандарты, згодна зь якімі ён будзе праводзіцца. Таксама трэба будзе сфармуляваць пытаньні, без дакладных адказаў на якія працаваць у межах Асамблеі цяжкавата. Гэта такія пытаньні, як "колькі нас?", "якія мы?", "чым мы займаемся?".

Увогуле ж пра неабходнасьць маніторынгу і аналізу гаварылі ці ня ўсе сябры Рабочай групы, распрацоўшчыкі Стратэгічнага пляну і дэлегаты V Кангрэсу. Але якім яму быць? Навошта ён патрэбны? Хто яго будзе праводзіць? Менавіта гэта неабходна высьветліць на заплянаванай канфэрэнцыі. І паводле яе вынікаў трэба ўдакладніць Рабочы плян працы ў гэтым кірунку. Ужо сёньня можна казаць пра тое, што да працы будуць прыцягнутыя сябры Рабочай групы, спэцыялісты ў галіне мэтадалёгіі, сацыялёгіі, паліталёгіі і, натуральна, актывісты няўрадавых арганізацыяў.

Рабочыя пляны, прэзэнтаваныя на пасяджэньні 19-20 чэрвеня, былі прынятыя за аснову, а некаторыя зацьверджаныя да выкананьня. Мяркуецца, што, калі пляны будуць канчаткова зацьверджаныя Рабочай групай, усім сябрам Асамблеі будзе прапанавана ўзяць удзел у мерапрыемствах. Але вітаюцца і папярэднія прапановы для ўнясеньня ў Рабочыя пляны".

Асаблівую ўвагу сябры РГ надалі абмеркаваньню **пытаньня аб правядзеньні пераўліку сябраў Асамблеі**. Неабходнасьць пераўліку была прызнаная ўсімі сябрамі РГ. Да разгляду быў прапанаваны мэханізм, паводле якога можа адбывацца пераўлік. РГ вырашыла прыняць гэты мэханізм за аснову з улікам выказаных заўвагаў. На наступным пасяджэньні, якое адбудзецца ў верасьні, будуць разгледжаныя ўсе дакумэнты, зьвязаныя зь пераўлікам, і вызначаныя тэрміны яго правядзеньня.

"На сёньняшні дзень у склад Асамблеі ўваходзіць 532 арганізацыі (перад Кангрэсам Выканаўчае бюро праводзіла абзвон усіх сябраў Асамблеі, пасьля чаго было выяўлена, што шэраг арганізацыяў спынілі сваё існаваньне). Каб высьветліць, якія арганізацыі "жывыя", у якіх кірунках дзейнасьці яны працуюць, ці гатовыя яны браць удзел у рэалізацыі стратэгічнага пляну Асамблеі, на пасяджэньні новай Рабочай групы было прынятае рашэньне аб падрыхтоўцы і пачатку пераўліку сябраў Асамблеі. На наступным пасяджэньні вызначым тэрміны, разгледзім дакумэнты, а таксама абмяркуем зьмены ў правілах прыёму ў склад Асамблеі", - камэнтуе Віталь Васількоў, які рыхтаваў пытаньне аб пераўліку да абмеркаваньня.

Сябры новай Рабочай групы, абранай на V Кангрэсе Асамблеі, два дні працавалі ў вельмі напружаным рэжыме: шмат пытаньняў было пастаўлена ў парадак дня, многія зь іх - вельмі палемічныя. "Старажылы" Рабочай групы (маем на ўвазе тых, хто ўжо ня першы год працуе ў Рабочай групе Асамблеі) адзначылі, што на іх памяці такіх пасяджэньняў, на якіх сябры РГ настолькі плённа працавалі, яшчэ не было. Вацлаў Арэшка, якога ня першы раз абіраюць у склад РГ, параіў праводзіць пасяджэньні кіраўнічага органу ня так часта, як гэта было раней, але працаваць на іх у такім фармаце, як 19-20 чэрвеня. "На маю думку, гэта было самае плённае і канструктыўнае пасяджэньне Рабочай групы за некалькі апошніх год. Паколькі я наведваю Рабочыя групы амаль ад самага пачатку існаваньня Асамблеі, то мне вельмі прыемна бачыць, што РГ стала сапраўдным кіраўнічым органам, які вырашае ключавыя пытаньні для Асамблеі", - адзначыў сп. Арэшка.

Пасяджэньне Рабочай групы, якое адбылося 19-20 чэрвеня, пакінула вельмі добрыя ўражаньні ў старшыні Рабочай групы Асамблеі **Сяргея Мацкевіча**: "Нам удалося разгледзець шмат пытаньняў. Безумоўна, розныя пытаньні былі прапрацаваныя па-рознаму: дзе была праведзена сур'ёзная папярэдняя праца ў распрацоўцы рабочых плянаў, там не было шмат супярэчнасьцяў у абмеркаваньні. Таму адна з высноваў, якую мы можам зрабіць для сябе, - да пасяджэньняў Рабочай групы трэба рыхтавацца. Вельмі добра, што пасяджэньне адбывалася на працягу двух дзён. Мы мелі дастаткова часу для таго, каб даволі грунтоўна разгледзець пытаньні парадку дня.

Амаль на кожным пасяджэньні Рабочай групы папярэдняга скліканьня кворум быў вельмі балючым пытаньнем. Вельмі прыемна, што цяпер такога пытаньня не паўстала. Я думаю, гэта ёсьць вынікам таго, што сябрамі Рабочай групы сталі зацікаўленыя і досыць падрыхтаваныя людзі, якія не імкнуцца прадэманстраваць сваё аратарскае майстэрства, а гатовыя інтэнсіўна працаваць. Да таго ж, на нашым пасяджэньні прысутнічалі і распрацоўшчыкі Стратэгічнага пляну, якія і цяпер не застаюцца па-за межамі далейшай працы.

Пасяджэньне паказала, што зьмяняюцца адносіны сябраў Рабочай групы да ўскладзеных на іх абавязкаў і да Асамблеі наагул. Мы пачынаем дасягаць звышмэты, пастаўленай на Кангрэсе: каб людзі адчувалі сябе ня звонку Асамблеі, а ўнутры. Сябры Рабочай групы пачынаюць мысьліць катэгорыямі "мы", а ня "вы". І гэта вельмі ўсьцешвае".

Падрыхтавалі АА і АВ-Ч

“Мы павінны стварыць умовы для разьвіцьця арганізацыйнай культуры”

Фота Андрэя Лянкевіча

Вынікі пасяджэньня Рабочай групы Асамблеі НДА Беларусі камэнтуе Ірына Жыхар, намесьніца старшыні РГ, адказная за напрамак “Стварэньне ўмоваў для арганізацыйнага разьвіцьця арганізацыяў - сябраў Асамблеі”.

Пасьля V Кангрэсу я ўзяла на сябе адказнасьць за дапрацоўку стратэгічных мэтаў і задачаў па арганізацыйным разьвіцьці сябраў Асамблеі. За гэты час была створана творчая група, у якую ўвайшлі зацікаўленыя ў рэалізацыі гэтага напрамку людзі, а таксама праведзеныя некалькі нарадаў. Падчас гэтых пасяджэньняў мы сумесна дапрацавалі стратэгічныя задачы, зрабілі іх дастаткова дакладнымі і, на маю думку, зразумелымі для ўсіх. Да таго ж, мы структуравалі Рабочы плян, які быў прыняты за аснову на пасяджэньні Рабочай групы, але патрабаваў дапрацоўкі згодна з распрацаванымі задачамі.

У нас ужо ёсьць дакладны плян дзеяньняў на бліжэйшыя два месяцы, і я лічу гэта посьпехам. У межах задачы стварэньня асяродку кансультантаў і экспэртаў у арганізацыйным разьвіцьці трэцяга сэктару ў бліжэйшы час мы будзем займацца падрыхтоўкай сустрэчы, удзельнікамі якой стануць працаўнікі сфэры арганізацыйнага разьвіцьця: кансультанты, экспэрты трэцяга сэктару, кансультанты бізнэс-структураў - усе тыя, каго мы ведаем і хто разумее каштоўнасьць такой працы для разьвіцьця структураў трэцяга сэктару. Правядзеньне гэтай сустрэчы заплянавана на пачатак верасьня. Цяпер ідзе падрыхтоўка, за якую адказваюць Улад Вялічка і Сяргей Кручынін.

У пэрспэктыве, апрача іншага, мы плянуем правесьці грунтоўнае дасьледаваньне прафэсійна-кансультацыйнага асяродзьдзя, і, каб не сьпяшацца з выпрацоўкай мэтадалёгіі дасьледаваньня, вырашылі пачаць рэалізоўваць гэтую задачу з правядзеньня згаданай сустрэчы. Пасьля яе мы плянуем больш дакладна высьветліць групу зацікаўленых асобаў, якія далучацца да распрацоўкі мэтадалёгіі дасьледаваньня і яго правядзеньня.

Добра, што ўжо цяпер выяўляюцца арганізацыі, зацікаўленыя ва ўласным разьвіцьці. Калі арганізацыя ствараецца, яна трымаецца перш за ўсё на зацікаўленасьці, на імпэце сябраў, людзі яднаюцца для вырашэньня нейкай вострай праблемы. Але зь цягам часу ўзьнікаюць пэўныя непаразуменьні паміж сябрамі, выказваюцца розныя погляды на тое, як працаваць і куды ісьці далей. Арганізацыйнае разьвіцьцё якраз і закліканае прафэсійна вырашаць усе праблемы арганізацыі на любым этапе яе існаваньня. Вядома, што многія людзі ўспрымаюць перамены ў дзейнасьці як рэвалюцыю, і гэтая рэвалюцыйнасьць мусіць правільна разумецца, і нават плянавацца. Мы, працуючы ў трэцім сэктары, мусім разумець, што крызысы - гэта нармальна, гэта пэўны этап любога разьвіцьця. І таму крызысаў ня варта баяцца - трэба ўмець іх пераадольваць з максымальнай карысьцю для арганізацыяў.

Сябры творчай групы добра разумеюць, што заплянаваная намі праца патрабуе ня толькі шмат чалавечых, часавых рэсурсаў, але і добрай матэрыяльна-тэхнічнай базы. Таму ў бліжэйшыя два месяцы мы будзем працаваць над стварэньнем пляну фандрэйзынгу, над вызначэньнем магчымасьцяў скарыстаць рэсурсы іншых арганізацыяў дзеля таго, каб рэалізаваць заплянаванае ў агульнай сыстэме. Гэта ўсё робіцца для таго, каб праз год мы маглі сказаць, які плён дала наша праца. Аднак безь фінансавай падтрымкі нам ня ўдасца ажыцьцявіць усё, што мы заплянавалі.

Мы вельмі зацікаўленыя ў рэалізацыі задачы аналізу патрэбаў і інтарэсаў арганізацыяў у аргразьвіцьці. Таму мы зьвернемся да Віталя Васількова, які адказвае за ўсе дасьледаваньні ў межах Асамблеі, з прапановаю разам абмяркоўваць мэтадалёгію вывучэньня інтарэсаў і патрэбаў НДА ў аргразьвіцьці. Гэта будзе комплекснае дасьледаваньне ўсіх накірункаў дзейнасьці Асамблеі. І такім чынам мы зробім свой унёсак у агульную працу.

На пэрспэктыву, акрамя дасьледаваньня, мы плянуем правесьці шэраг адукацыйных мерапрыемстваў, якія дазволяць грамадзкім актывістам даведацца, што такое аргразьвіцьцё і навошта яно патрэбнае. Спадзяюся, адукацыйныя НДА дапамогуць сваімі праграмамі ў правядзеньні гэтых сэмінараў. Мы павінны стварыць умовы для разьвіцьця арганізацыйнай культуры, таму правядзеньне абласных адукацыйных сэмінараў толькі дапаможа ў гэтым. Мы лічым неабходным ня проста прасоўваць культуру і казаць, што гэта добра, але і паказваць досьвед працы, паслугі і прадукты, што вырабляюцца арганізацыямі, якія сьвядома ахвяруюць частку свайго часу на арганізацыйнае разьвіцьцё. Посьпех такіх арганізацыяў нашмат больш якасны.

Жывая мова нашага сэктару: “GONGO, MONGO... BINGO!”

*Каротка пра скарачэньні**

Юры Чавусаў

Кожны абсяг чалавечай дзейнасьці імкнецца да абмежаваньня ад астатніх. Імкненьне выявіць сваю непадобнасьць і адметнасьць ад іншых - не апошняя з праяваў сацыяльнай спэцыялізацыі і стратыфікацыі. Дзеля гэтай функцыі служыць наяўнасьць прафэсійнага слэнгу, і няўрадавыя арганізацыі ў гэтым сэнсе не выключэньне сярод іншых прафэсійных супольнасьцяў. У нашым асяродзьдзі словы “сетка” альбо “праект” маюць адмысловае, не кожнаму зразумелае значэньне, а сутнасьць тэрмінаў “фандрэйзынг” (а тым больш “фандрэйзынг па-беларуску”) альбо “місія” ці “сэмінар” цяжка растлумачыць нават самому сабе, ня тое што сваім калегам. Карацей, супольнасьць “трэцяга сэктару” (яшчэ адзін прафэсійны нэалягізм!) фармуе ўласную мову.

На гэтыя працэсы натуральным чынам накладаюцца слэнгавыя запазычанасьці-англіцызмы. Імпартаваны і ініцыяваны з Захаду фэномэн няўрадавых арганізацыяў, у тым выглядзе, як іх разумеюць заходнія “спонсары”, і шчыльныя кантакты з апошнімі прывялі да павелічэньня моўных запазычанасьцяў у супольнасьці беларускіх грамадзкіх дзеячоў і актывістаў. Калі нейкая зьява беларускага трэцясэктарнага жыцьця ня мае дакладнага азначэньня - трэба абазваць яе нейкім словам ангельскага паходжаньня, і тады праблема азначэньня выглядае быццам бы вырашанай, няхай сабе гэты англіцызм ня мае нічога супольнага зь беларускай рэчаіснасьцю. Напрыклад, вялікая частка беларускіх гэтак званых “валанцёраў” (па беларуску - “добраахвотнікаў”) па сваёй сутнасьці валанцёрамі не зьяўляюцца, бо ім плацяць грошы за дзейнасьць у межах праектаў.

Мова зьяўляецца толькі адным з фактараў, што фармуюць нашую сьвядомасьць. Але недаацэньваць уплыў моўнага фактару на беларускую сацыяльную рэчаіснасьць таксама ня варта - дастаткова прасачыць уплыў слова “ліквідацыя” на дзейнасьць некаторых беларускіх грамадзкіх аб’яднаньняў у апошні год. Менавіта праз недакладнасьці з катэгорыямі паўстаюць шматлікія праблемы ва ўнутранай камунікацыі беларускага грамадзкага сэктару - гэта адзін з тых ідалаў, якія, паводле Фрэнсыса Бэкана, перашкаджаюць ведам. Цікаўных адсылаем да цікавай “Энцыкляпэдыі тэрмінаў для грамадзкіх арганізацыяў” (паказальна, што словы ў ёй даюцца ў беларускім, расейскім і ангельскім напісаньні), а мы павядзем пра іншае.

У англіфікаваным прафэсійным слэнгу беларускіх няўрадавых актывістаў асаблівае месца займаюць тыя азначэньні, якія служаць для самаідэнтыфікацыі і ідэнтыфікацыі ўласных грамадзкіх фармаваньняў - арганізацыяў, фондаў, ініцыятываў, установаў, рухаў, камітэтаў... У беларускай мове склаўся ўстойлівы тэрмін “няўрадавая арганізацыя”, які шырэйшы за вызначаныя заканадаўствам азначэньні “грамадзкае аб’яднаньне” альбо “некамэрцыйная арганізацыя” і служыць для абагульненага ўказаньня на ўсе структуры грамадзянскай супольнасьці ва ўсёй разнастайнасьці магчымых структурных і прававых формаў.

Відавочна, што тэрмін “няўрадавая арганізацыя” ёсьць літаральнай калькай з ангельскага *non-governmental organization* (скарочана -*NGO*). Адпаведна, паўстаў і адпаведнік ангельскай абрэвіятуры гэтага тэрміну: *NGO* ў нашых мясьцінах прынята перакладаць як НДА. Гэтае скарачэньне выкарыстоўваецца як сынонім тэрміну “няўрадавая арганізацыя”, хоць паходзіць ад іншага, таксама распаўсюджанага, але ня вельмі ўдалага тэрміну “недзяржаўная арганізацыя” (Асамблея НДА аб’ядноўвае “няўрадавыя дэмакратычныя арганізацыі” - хоць лягічней было б ёй быць “Асамблеяй ДНА”). Такая моўная канцэпцыя склалася ў 90-я гады мінулага стагодзьдзя ў выніку даволі інтэнсіўных дыскусіяў у пэрыяд шпаркага разьвіцьця структураў грамадзянскай супольнасьці ў нашай краіне. У расейскай мове былі прынятыя адпаведнікі “*неправительственная организация*”, скарочана НПО (што больш дакладна), альбо “*некоммерческая организация*” (НКО), што паходзіць хутчэй ад ангельскага *non-profit organization*. Апошняе азначэньне і адпаведная абрэвіятура *NPO* ўсё больш пашыраецца ў англамоўных крыніцах замест звыклага *NGO*.

Пашыранасьць розных азначэньняў сьведчыць пра тэрміналягічныя складанасьці. Большасьць зь іх у пэўнай ступені ўдала азначаюць тыя ці іншыя бакі прадмету, але выкарыстаньне таго ці іншага тэрміну хутчэй зьяўляецца справай густу, а ня зьвязана з пошукам больш дакладнага азначэньня. Ды, зрэшты, гэтыя лексычныя пытаньні ўласьцівыя ня толькі нашай мове і нашаму рэгіёну: у сусьветнай літаратуры выкарыстоўваецца процьма назваў, скарачэньняў, мэтафарычных і сымбалічных азначэньняў для гэтага рою выяўленьняў грамадзкай актыўнасьці. Большасьць зь іх зьвязана з англамоўным паходжаньнем і гэтак званым “трохсэктарным бачаньнем” грамадзтва.

Калі казаць пра распаўсюджанасьць, то, відавочна, найбольшым посьпехам карыстаецца вышэйзгаданае скарачэньне *NGO*. Менавіта самаіранічныя выслоўі “энжэошнік” альбо “энжэошны” могуць быць адзнакай сапраўды “закаранелага” (то бок прафэсійнага) грамадзкага актывіста. Але самае распаўсюджанае азначэньне ня ёсьць самым дакладным: яно не зьвяртае ўвагі на адрозьненьні паміж роз-

* Пры падрыхтоўцы дадзенага тэксту былі скарыстаныя матэрыялы “Хрэстаматыі для некамэрцыйных арганізацыяў” Душана Андрушака, пра якую больш падрабязна мы напішам у наступным нумары “Асамблеі”. Рэдакцыя прапануе працягнуць дыскусію адносна мовы беларускага “трэцяга сэктару” і запрашае чытачоў да выказваньня сваіх меркаваньняў па гэтай праблеме.

нымі формамі прыватных арганізацыяў. Пад разуменьне "няўрадавай арганізацыі" павінны падпадаць такія розныя зьявы, як прыватныя фірмы, асацыяцыі і таварыствы, прафсаюзы, грамадзкія асацыяцыі, органы самакіраваньня, рэлігійныя арганізацыі і нават партыі, што не знаходзяцца пры ўладзе. Нават калі ў якасьці крытэру дадаць непрыбытковы характар дзейнасьці (адсутнасьць мэты атрыманьня прыбытку) і добраахвотнасьць - усё роўна набор суб'ектаў атрымліваецца занадта стракаты. Такім чынам, гэты тэрмін самы пашыраны ня толькі паводле свайго ўжываньня, але і паводле свайго зьместу.

З гэтай прычыны зьявіліся падзелы прыватных непрыбытковых добраахвотных арганізацыяў адпаведна вэктару скіраванасьці іх актыўнасьці - на сябе і сваіх сябраў альбо вонкі, на астатняе грамадзтва. Такім чынам, услухаемся, "як файна гучыць у ейных вуснах":

MINGO (members interested NGO) - няўрадавыя арганізацыі, скіраваныя на сваіх сябраў. Часам для гэтага тыпу выкарыстоўваецца яшчэ больш дакладны тэрмін *MBO (mutual benefit organization)*. Сюды адносяцца разнастайныя аб'яднаньні і таварыствы, а таксама парасонавыя структуры і гэтак званыя "сэрвісныя арганізацыі", што аказваюць дапамогу іншым арганізацыям;

PINGO (public interested NGO) - няўрадавыя арганізацыі, якія маюць за мэту дасягненьне нейкіх выгодаў для грамадзтва. Сюды адносяцца разнастайныя фундацыі, дабрачынныя ўстановы і іншыя структуры, дзейнасьць якіх скіраваная на асобаў, што не зьяўляюцца актывістамі гэтых арганізацыяў. Таксама для гэтых суб'ектаў выкарыстоўваецца тэрмін *PBO (public benefit organization)* - яны апекуюць агульнасацыяльную карысьць, дапамагаюць іншым, часам нават незнаёмым людзям.

Таксама існуе падзел паміж структурамі, што паўстаюць (часьцей за ўсё спантанна) зьнізу як самапомач людзей, і прафэсійнымі, добра арганізаванымі структурамі. Першыя прынята называць *grass-root*, бо яны, як карані травы, густа пакрываюць зямлю і зьвязваюць супольнасьць. Другія гучна называюць сабе *BINGO (big NGO)* - вялікія НДА.

Адрозьненьні ў спосабах фінансаваньня няўрадавых арганізацыяў спарадзілі сонм слэнгавых выразаў, якія часам даволі трапна паказваюць на адхіленьні арганізацыяў ад клясычнага разуменьня *NGO:*

GONGO (governmental NGO) - "урадавыя няўрадавыя арганізацыі" альбо *GRINGO (governmentally run and inspired/initiated NGO)* - кіраваныя альбо натхнёныя, арганізаваныя ўрадам няўрадавыя арганізацыі. Служаць выкананьню дзяржаўных інтарэсаў шляхам кіраваньня грамадзкай актыўнасьцю. Часьцей за ўсё харчуюцца зь дзяржаўнага бюджэту, аднак у некаторых краінах, наадварот, служаць сродкам папаўненьня бюджэтнага дэфіцыту шляхам прыцягненьня прыватных донарскіх сродкаў з-за мяжы для вырашэньня тых задачаў, якія стаяць перад дзяржаўнымі органамі;

BONGO (business organized NGO) - няўрадавыя арганізацыі, арганізаваныя прадпрымальніцкімі коламі. Гэта можа быць не імкненьне да "супрацоўніцтва паміж сэктарамі", а спроба ўхіліцца ад падаткаў. Але пад гэтую катэгорыю падпадае шмат сумленных арганізацыяў, для якіх карпаратыўны капітал зьяўляецца крыніцай фінансаваньня;

DONGO (donors organized NGO) - арганізацыі, адмыслова створаныя пад нейкую фінансавую ініцыятыву звонку. У дадзеным выпадку часьцей за ўсё гаворка не вядзецца пра вырашэньне грамадзкай праблемы, а вырашаецца пытаньне "як выдаткаваць сродкі такім чынам, каб спонсар быў задаволены". Даволі брыдкія стварэньні;

MONGO (money oriented NGO) - выклікаюць яшчэ менш павагі, паколькі ствараюцца людзьмі выключна для выпампоўваньня сродкаў з разнастайных фундацыяў ня толькі без намеру вырашаць нейкую праблему, але і нават без намеру рэалізоўваць прафінансаваныя праекты, - чысты крымінал;

іншы варыянт *MONGO (my own NGO)* ствараецца адным чалавекам і знаходзіцца пад ягоным асабістым уплывам - гэта фактычна прыватная няўрадавая арганізацыя.

Усе з пазначаных адхіленьняў добра вядомыя беларускаму трэцяму сэктару, ці ня праўда?

Яшчэ існуе шэраг ужо зусім сьмешных выслоўяў, якія трапна пазначаюць недахопы няўрадавых арганізацыяў шляхам гульні з ангельскім гучаньнем слова *NGO,* якое супадае з выслоўем *"and go"* - "і йдзі":

COM'N GO (то бок "прыйдзі і сыйдзі") - гэтыя арганізацыі распадаюцца яшчэ да таго, як выканаюць сваю місію. Таксама тут можна пабачыць намёк на замежныя фундацыі, якія прыходзяць у краіны Ўсходняй Эўропы без акрэсьленай мэты, дзейнічаюць без аніякай стратэгіі, ствараюць сетку *DONGO-MONGO,* а пасьля сыходзяць, не дасягнуўшы аніякіх пазытыўных вынікаў;

WASH'N GO ("памый і йдзі") — насьмешка над арганізацыямі, якія пад выглядам гуманітарнай альбо дабрачыннай дзейнасьці займаюцца адмываньнем брудных грошай.

Прапануем чытачу самому працягнуць гульню з словамі, прыдумляючы трапны ярлык для сваёй уласнай арганізацыі. Гаворка не пра зьдзек, а пра пошук недахопаў у нас саміх — крытычны погляд у люстэрка часам можа дапамагчы не ператварыцца ў пачвару.

{ ДАВЕДКА «АСАМБЛЕІ» }

Пошукавая сыстэма "Google" (у дужках - "Yahoo!") выдае наступную колькасьць спасылак у Інтэрнэце на адпаведныя запыты:
няўрадавая арганізацыя — 88 (53);
недзяржаўная арганізацыя - 106 (68);
НДА - 31600 (97900);
некамэрцыйная арганізацыя - 15 (13);
Non-governmental organization - 831000 (2160000);
NGO - 5050000 (3740000);
Non-profit organization - 5970000 (10200000);
некоммерческая организация - 51500 (182000);
НКО - 109000 (124000);
неправительственная организация - 134000 (27000);
НПО - 283000 (488000);
"трэці сэктар" - 2870 (1090);
"третий сектор" - 45000 (22600).

Аматары “жывой гісторыі”

Гісторыя прываблівае ня толькі прафэсійных дасьледчыкаў, але і аматараў. Што да беларускай гісторыі, то працы хопіць усім - яна поўная “белых плямаў”, якія зьнікаць не сьпяшаюцца. Ужо шосты год сотні хлопцаў і дзяўчат з усёй краіны займаюцца дасьледаваньнем “блізкай гісторыі” - гісторыі XX стагодзьдзя. Яны пішуць свае першыя працы, робяць цікавыя знаходкі, захапляюцца гісторыяй так, што некаторыя вырашаюць стаць прафэсійнымі дасьледчыкамі нашай мінуўшчыны. Адзіны ў Беларусі гістарычны конкурс для школьнікаў праводзіць грамадзкае аб’яднаньне “Дыярыюш”. Карэспандэнт “Асамблеі” размаўляе з кіраўніком праекту, супрацоўніцай ГА “Дыярыюш” Ірынай Коваль.

- Наколькі актыўна ўдзельнічаюць сёньня школьнікі ў гістарычных конкурсах?

- На апошні наш конкурс было дасланa 390 работ. Некаторыя школьнікі самі тэлефануюць, цікавяцца: “А ці не пачаўся ў вас новы конкурс? Вы пра мяне не забудзьцеся...” Іншы раз да ўдзелу іх заахвочваюць настаўнікі, якія выступаюць у якасьці куратараў. Напрыклад, настаўнік літаратуры Менскага машынабудаўнічага каледжу Ўладзімер Сурмянкоў настолькі апантаны чалавек, што ягоныя навучэнцы пішуць па 100 работ на конкурс. Нядаўна мы забіралі іх, прыехаўшы ў каледж на машыне... Выхаванцы Сурмянкова стабільна займаюць 2-3 месцы на конкурсе.

- А якая мэта гэтых конкурсаў? Заахвоціць школьнікаў зьбіраць старыя паперы, успаміны, як раней макулятуру ці мэталалом?

- Ведаеце, у несвабодных краінах гісторыю пішуць “разумныя дзядзькі”, і нярэдка - на замову ўлады. Зьмяняецца ўлада - і яны яе зноў перапісваюць... Адна з магчымасьцяў аднавіць праўдзівую карціну нядаўняй гісторыі - зьбіраць вусныя сьведчаньні людзей. Можна замоўчваць сталіншчыну і ня згадваць пра яе ў падручніках. Але калі дзеці даведаюцца ад старэйшых пра тыя часы, яны будуць думаць і параўноўваць.

Мэта нашых конкурсаў - праз дасьледаваньне блізкага асяродзьдзя (сям’і, вуліцы, вёскі) падыйсьці да вывучэньня глыбальнай гісторыі, гісторыі краіны. У Нямеччыне даводзілася чуць, што ў дзяцей у заходнеэўрапейскіх краінах прападае інтарэс да гісторыі. І яго нейкім чынам трэба вярнуць. Інтарэс узьнікае якраз тады, калі ты дасьледуеш нешта блізкае. А яшчэ такія конкурсы садзейнічаюць яднаньню пакаленьняў, бо часта даводзіцца чуць, што старэйшае і малодшае пакаленьні не разумеюць адно аднаго...

> “Досьвед правядзеньня конкурсаў паказвае, што нашым дзецям хочацца жыць у эўрапейскай, заможнай краіне, хочацца ганарыцца сваёй краінай, сьцягам, гербам, сваім прэзыдэнтам”.

- Ці зрабілі школьнікі нейкія цікавыя знаходкі падчас падрыхтоўкі конкурсных работ?

- Так. Пераможца аднаго з конкурсаў Ганна Руткіна сабрала шмат цікавых матэрыялаў “з бабулінага куфра”. Напрыклад, дакумэнты пра тое, колькі ў пасьляваенныя гады калгасьніца, удава павінна была здаць падаткаў дзяржаве. Грунтуючыся на дакумэнтах, лічбах, яна паказала, якой жорсткай і бязьлітаснай у адносінах да людзей была савецкая сыстэма.

- Ці не зьяўляюцца ва ўдзельнікаў конкурсаў праблемы ў навучальных установах, асабліва калі вынікі іх пошукаў уваходзяць у супярэчнасьць з тым, што напісана ў падручніках пра нядаўнюю гісторыю?..

- Я пра такое ня чула. Хаця быў адзін выпадак, калі група дзяцей з Гарадзенскага раёну напісала гісторыю свайго калгасу на аснове запісаных успамінаў людзей. Іх праца была прызнаная лепшай (сябра рады конкурсу сп. Алег Трусаў назваў яе “кандыдацкай работай”), за першае месца яны атрымалі кампутар (гэта быў самы першы наш конкурс). Дык школа хацела забраць у дзяцей гэты кампутар, але яны не аддавалі, бо навучальная ўстанова падчас падрыхтоўкі працы нічым ім не дапамагала. Справа дайшла да раённага аддзелу адукацыі. Праблемы былі ня толькі ў настаўніка гісторыі - куратара, школьнікаў, але нават і ў калгасу. Дзяцей запалохвалі тым, што калі яны будуць і надалей удзельнічаць у падобных конкурсах, у іх будуць праблемы пры паступленьні ў ВНУ... Але гэта адзіны выпадак. Быў выпадак, калі аддзел адукацыі аднаго з раёнаў загадаў усім школам узяць удзел у конкурсе “Мой радавод” “для выхаваньня гонару за сваю Радзіму” і даслаў нам гэты дакумэнт.

Ірына Коваль. Фота Глеба Лабадзенкі

Пераможцы конкурсу “Мой радавод. Лёс сям”і ў XX стагодзьдзі”, 2000 г.

- Апошні ваш дасьледчы конкурс называецца вельмі інтрыгоўна - "Чужы сярод сваіх"...

- Мы вырашылі дасьледаваць тэму рознасьці, адметнасьці і адзіноты чалавека ў грамадзтве. Прычым робім акцэнт не на псыхалёгію, а на гістарычны аспэкт. Чаму шмат людзей у Беларусі часам адчуваюць сябе адзінока, адчуваюць сябе чужымі сярод сваіх людзей? Гэта хворыя, інваліды, "аўганцы", "чарнобыльцы". Гэта могуць быць людзі, якія выйшлі з турмы і ня могуць адаптавацца ў гэтым грамадзтве. Хто вінаваты ў гэтым - яны самі ці іх блізкія? А можа, вінаватая дзяржава, якая робіць людзей калекамі, бамжамі? А палітычна актыўныя людзі ў Беларусі? Калі чалавек размаўляе па-беларуску, ён таксама "чужы сярод сваіх"...

Тэма даволі шырокая. І XX стагодзьдзе дае нам шмат такіх прыкладаў, асабліва Другая сусьветная вайна.

- Ці адсочваеце вы далейшы лёс удзельнікаў конкурсаў?

- Некаторыя хлопцы і дзяўчаты пасьля паступілі ў ВНУ на гістарычны факультэт. Некаторыя пішуць нам лісты, хочуць падтрымліваць кантакты, шкадуюць, што паводле ўзросту ўжо ня могуць удзельнічаць у конкурсах, прапануюць дапамогу, захвочваюць да ўдзелу сваіх знаёмых, сваякоў. А адзін з удзельнікаў конкурсу "Мой радавод" Андрэй Камоска, аўтар вельмі скрупулёзнага дасьледаваньня, сёлета будзе ўдзельнічаць разам зь Сяргеем Доўбікам у адмысловай нямецкай праграме.

А яшчэ на прозьбу былых удзельнікаў конкурсаў мы вырашылі стварыць агульнанацыянальны моладзевы клюб "Блізкая гісторыя". Яго задача - спрыяць выхаваньню ў моладзі патрыятызму, павагі да нацыянальных традыцыяў, каштоўнасьцяў, а таксама прапагандаваць ідэалы дэмакратыі. У клюбе мы праводзім дыскусійныя сустрэчы па розных цікавых тэмах сучаснай гісторыі, мэтадычныя спатканьні, ладзім сустрэчы зь цікавымі людзьмі, праводзім лекцыі, вучым браць інтэрвію.

Цікавыя ідэі, якія прадукуюцца грамадзкімі аб'яднаньнямі, нярэдка перахопліваюцца ўладамі. Зусім нядаўні прыклад - у Сьвіслацкім раёне на Гарадзеншчыне ўлады прынялі рашэньне зьдзейсьніць запісы ўспамінаў больш як двухсот вэтэранаў вайны. Праект назвалі "Жывая гісторыя", а яго рэалізацыяй займаюцца школьнікі на чале са сваімі настаўнікамі...

Вінцэсь Дземянчук

{ БЛІЗКАЯ ГІСТОРЫЯ }

Чужы сярод сваіх

Конкурс для школьнікаў. Пераможцаў чакаюць прызы!

Грамадзкае аб'яднанне "Дыярыюш" пры ўдзеле Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны абвяшчае конкурс "Чужы сярод сваіх".

У конкурсе могуць браць удзел вучні сярэдніх навучальных устаноў (пачынаючы з 7-й клясы): школаў, ліцэяў, гімназіяў, а таксама навучэнцы каледжаў, ПТВ, тэхнікумаў (да 19 гадоў).

Форма конкурснай працы адвольная: сачыненьне, інтэрвію, фільм і інш. Калі праца нятэкставая (аўдыё-, відэа-, фатаздымкі), да яе павінна быць далучана пісьмовая частка, якая адлюстроўвае працэс дасьледаваньня альбо заключае камэнтар да крыніцаў.

Працу пажадана пісаць на беларускай мове, яе можна выконваць індывідуальна альбо групай, самастойна альбо з дапамогай куратара.

Да працы абавязкова павінна быць далучана анкета ўдзельніка з прозьвішчам, імем удзельніка, яго каардынатамі і назвай працы, а таксама з прозьвішчам, імем і каардынатамі кіраўніка (пры яго наяўнасьці).

Працу трэба дасылаць у адным асобніку да 25 лістапада 2004 г. (дата вызначаецца па паштовым штэмпелі) на адрас: "Блізкая гісторыя", а/с 128, 220064, Мінск.

Вынікі конкурсу будуць абвешчаныя 25 сакавіка 2005 г.

Усю патрэбную інфармацыю, парады і брашуру, у якой падрабязна выкладзены ўмовы конкурсу, можна атрымаць ад сакратара конкурсу Ірыны Коваль (праз тэлефон (8-017) 223-61-42, 8-0296136087, праз эл. пошту: historyja@belinter.net, праз пошту: "Блізкая гісторыя", а/с 128, 220064, г. Мінск).

Жадаем посьпехаў!

{ ДАВЕДКА «АСАМБЛЕІ» }

Конкурсы па блізкай гісторыі для школьнікаў пачалі праводзіцца больш за 30 гадоў таму ў Нямеччыне. З такой ініцыятывай выступіў бізнэсовец Кёрбэр, які заснаваў для фінансаваньня праектаў адмысловы фонд. Сёньня ўжо існуе міжнародная арганізацыя EUSTORY, якая аб'ядноўвае ў адзіную сетку аналягічныя праграмы з чатырнаццаці эўрапейскіх краінаў. Фонд жа зьяўляецца мэтадычным цэнтрам, які курыруе конкурсы, рэгулярна зьбірае арганізатараў і пераможцаў на летнюю (праводзіцца ў Нямеччыне) і восеньскую школы (апошняя праходзіць штогод у розных краінах). Правядзеньнем конкурсаў у шэрагу краінаў Эўропы займаюцца самыя розныя арганізацыі, структуры. Напрыклад, у Эстоніі гэта робяць дзьве жанчыны - гістарыцы, што выкладаюць ва ўнівэрсытэце, у Польшчы - Цэнтар "Карта", які мае разгалінаваную структуру, архіў, займаецца дасьледчымі і выдавецкімі праектамі, а ў Баўгарыі конкурсы для школьнікаў праходзяць нават пад патранажам жонкі прэзыдэнта краіны. У Беларусі ж іх ладзіць грамадзкае аб'яднаньне "Дыярыюш".

Ухваленьне і рэгістрацыя праектаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі

Напрыканцы 2003 году зьмяніўся парадак рэгістрацыі міжнароднай тэхнічнай дапамогі. Раней з заявай аб рэгістрацыі яе праектаў (праграмаў), як правіла, зьвярталіся донары тэхнічнай дапамогі. У сувязі з прыняцьцем новых актаў заканадаўства з падобнай заявай могуць зьвяртацца толькі атрымальнікі тэхнічнай дапамогі. Паколькі многія некамэрцыйныя арганізацыі зьяўляюцца альбо зьбіраюцца стаць атрымальнікамі тэхнічнай дапамогі ў рамках праграмаў TACIS, ПР ААН, Каўнтэрпарт ды іншых, ім вельмі важна ведаць парадак рэгістрацыі такой дапамогі.

Вольга Смалянка,
юрыст. Да моманту ліквідацыі грамадзкага аб'яднаньня "Незалежнае таварыства прававых дасьледаваньняў" зьяўлялася сябрам яго Праўленьня.
Крыніца інфармацыі: электронная рассылка, islr@infonet.by
Пры падрыхтоўцы матэрыялу выкарыстоўвалася графічная табліца, падрыхтаваная прадстаўніцтвам Амэрыканскага дабрачыннага фонду CAP.

Пытаньні, якія датычацца міжнароднай тэхнічнай дапамогі[1] ў Рэспубліцы Беларусь, рэгулююцца наступнымі асноўнымі нарматыўнымі актамі:

1. Указ прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь ад 22 кастрычніка 2003 году № 460 "Аб міжнароднай тэхнічнай дапамозе, якая даецца Рэспубліцы Беларусь";

2. Пастанова Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 21 лістапада 2003 году № 1522 "Аб некаторых захадах па рэалізацыі Ўказу прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь ад 22 кастрычніка 2003 г. № 460". Гэтай пастановай зацьверджаны:

- Палажэньне аб Камісіі па пытаньнях міжнароднай тэхнічнай супрацы пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь і склад Камісіі па пытаньнях міжнароднай тэхнічнай супрацы пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь;

- Палажэньне аб парадку падрыхтоўкі, разгляду і ўхваленьня праектаў (праграмаў) міжнароднай тэхнічнай дапамогі, а таксама пералікаў тавараў (маёмасьці, у тым ліку грашовых сродкаў), работ і паслугаў, якія даюцца для рэалізацыі гэтых праектаў (праграмаў);

- Палажэньне пра суфінансаваньне праектаў (праграмаў) міжнароднай тэхнічнай дапамогі, якія рэалізуюцца ў Рэспубліцы Беларусь;

3. Пастанова Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь ад 19 сьнежня 2003 году № 246 "Аб зацьвярджэньні Палажэньня аб парадку рэгістрацыі праектаў (праграмаў) міжнароднай тэхнічнай дапамогі ў Рэспубліцы Беларусь, а таксама кантролю іх рэалізацыі".

Да асноўных нарматыўных актаў, якія датычаць пытаньняў атрыманьня міжнароднай тэхнічнай дапамогі, можна аднесьці таксама міжнародныя дамовы, на падставе якіх гэтая тэхнічная дапамога прадстаўляецца.

У адпаведнасьці з заканадаўствам міжнародная тэхнічная дапамога даецца Рэспубліцы Беларусь на падставе праектаў (праграмаў) міжнароднай тэхнічнай дапамогі[2], распрацаваных упаўнаважанымі рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіраваньня, юрыдычнымі асобамі і грамадзянамі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасьці з нацыянальнымі прыярытэтамі і праектнымі прапановамі, якія вызначаюцца Нацыянальнай праграмай міжнароднай тэхнічнай супрацы, а таксама праектаў (праграмаў), ініцыяваных і распрацаваных донарамі міжнароднай тэхнічнай дапамогі[3], ухваленых Саветам Міністраў Беларусі.

ПРАЕКТЫ (ПРАГРАМЫ), УКЛЮЧАНЫЯ Ў НАЦЫЯНАЛЬНУЮ ПРАГРАМУ МІЖНАРОДНАЙ ТЭХНІЧНАЙ СУПРАЦЫ

Распрацоўка праекту Нацыянальнай праграмы зьдзяйсьняецца Міністэрствам эканомікі на падставе прапановаў зацікаўленых рэспубліканскіх органаў кіраваньня на базе праграмы сацыяльна-эканамічнага разьвіцьця Рэспублікі Беларусь, а таксама іншых дзяржаўных праграмаў.

Ухваленая пастановай Савету Міністраў Беларусі Нацыянальная праграма накіроўваецца зацікаўленым асобам, уключаючы донараў міжнароднай тэхнічнай дапамогі. Праекты (праграмы) міжнароднай тэхнічнай дапамогі, уключаныя ў якасьці праектных прапановаў у Нацыянальную праграму, лічацца ўхваленымі, калі яны ня ўносяць зьменаў у праектныя прапановы па мэтах, задачах, сьпісе атрымальнікаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі, не прадугледжваюць прыцягненьня нацыянальнага суфінансаваньня. У іншых выпадках праекты (праграмы) міжнароднай тэхнічнай дапамогі павінны быць

1 Міжнародная тэхнічная дапамога - адзін зь відаў дапамогі, якая бязвыплатна даецца Рэспубліцы Беларусь донарамі міжнароднай тэхнічнай дапамогі ў мэтах аказаньня падтрымкі ў сацыяльных і эканамічных пераўтварэньнях, ахове навакольнага асяродзьдзя, ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, разьвіцьці інфраструктуры шляхам правядзеньня дасьледаваньняў, навучаньня, абмену спэцыялістамі, асьпірантамі і студэнтамі, перадачы досьведу і тэхналёгіяў, грашовых сродкаў, пастаўкі абсталяваньня і іншых тавараў (маёмасьці) па ўхваленых праектах (праграмах) міжнароднай тэхнічнай дапамогі.

2 Праект (праграма) міжнароднай тэхнічнай дапамогі - дакумэнт, які прадугледжвае комплекс узгодненых арганізацыйна-тэхнічных мерапрыемстваў, аб'яднаных агульнай мэтай і забясьпечаных часткова альбо цалкам за кошт перадачы донарамі міжнароднай тэхнічнай дапамогі грашовых сродкаў, у тым ліку ў замежнай валюце, тавараў (маёмасьці), выкананьня работ, аказаньня паслугаў.

3 Донары міжнароднай тэхнічнай дапамогі - міжнародная арганізацыя альбо яе прадстаўніцтва, замежная дзяржава ці яго адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка, упаўнаважаныя імі суб'екты права, якія даюць міжнародную тэхнічную дапамогу.

ухваленыя пастановамі Савету Міністраў Беларусі. Праекты (праграмы) міжнароднай тэхнічнай дапамогі, уключаныя ў якасьці праектных прапановаў у Нацыянальную праграму альбо ўхваленыя пастановай Савету Міністраў Беларусі, да пачатку іх рэалізацыі павінны прайсьці працэдуру рэгістрацыі ў Міністэрстве эканомікі.

РАЗГЛЯД І ЎХВАЛЕНЬНЕ ПРАЕКТАЎ (ПРАГРАМАЎ) МІЖНАРОДНАЙ ТЭХНІЧНАЙ ДАПАМОГІ, ІНІЦЫЯВАНЫХ І РАСПРАЦАВАНЫХ ДОНАРАМІ І ЯЕ АТРЫМАЛЬНІКАМІ

Донары міжнароднай тэхнічнай дапамогі сумесна зь яе атрымальнікамі[4] могуць ініцыяваць рэалізацыю канкрэтных праектаў (праграмаў) міжнароднай тэхнічнай дапамогі ў Рэспубліцы Беларусь.

Праекты (праграмы) міжнароднай тэхнічнай дапамогі, распрацаваныя яе атрымальнікамі сумесна з донарамі на базе праграмаў супрацоўніцтва донараў міжнароднай тэхнічнай дапамогі з Рэспублікай Беларусь і ня ўключаныя ў Нацыянальную праграму, павінны быць ухваленыя пастановамі Савету Міністраў Беларусі.

Пасьля пацьвярджэньня донарамі міжнароднай тэхнічнай дапамогі намераў выдаткаваньня сродкаў на фінансаваньне яе праектаў (праграмаў) атрымальнік такой дапамогі абавязаны мець заключэньне рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіраваньня і іншых дзяржаўных арганізацыяў, падначаленых Ураду Рэспублікі Беларусь і вызначаных у якасьці галаўных у супрацоўніцтве Беларусі зь міжнароднымі арганізацыямі, альбо абавязаны мець заключэньне Міністэрства замежных справаў па праектах[5], ініцыяваных замежнымі дзяржавамі ці іх адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі адзінкамі, пра адпаведнасьць праектаў (праграмаў) міжнароднай тэхнічнай дапамогі нацыянальным інтарэсам Рэспублікі Беларусь. Для атрыманьня заключэньня пра адпаведнасьць праектаў (праграмаў) міжнароднай тэхнічнай дапамогі нацыянальным інтарэсам Беларусі даецца апісаньне мэтаў, задачаў праекту, відаў дзейнасьці, абгрунтаваньне адпаведнасьці праектаў (праграмаў) міжнароднай тэхнічнай дапамогі нацыянальным інтарэсам Рэспублікі Беларусь, абгрунтаваньне сувязі праекту з праграмай сацыяльна-эканамічнага разьвіцьця Рэспублікі Беларусь да 2005 году.

табліца 1

У выпадку станоўчага заключэньня некамэрцыйныя арганізацыі - атрымальнікі міжнароднай тэхнічнай дапамогі падаюць дакумэнты яе праекту (праграмы), напрыклад пагадненьне аб гранце і заяўку, заяву з просьбай падрыхтаваць праект пастановы Савету Міністраў Беларусі аб яго ўхваленьні, а таксама заключэньне пра адпаведнасьць праектаў праграмаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі нацыянальным інтарэсам Рэспублікі Беларусь у аблвыканкамы і Менскі гарвыканкам па месцы рэгістрацыі. Аблвыканкамы і Менскі гарвыканкам забясьпечваюць падрыхтоўку праекту пастановы Савету Міністраў Беларусі па дадзеным пытаньні і перадаюць яго разам з праектам (праграмай) міжнароднай тэхнічнай дапамогі ў Камісію па пытаньнях міжнароднай тэхнічнай супрацы пры Савеце Міністраў Беларусі.

Ухвалены пастановай Савету Міністраў Беларусі праект (праграма) міжнароднай тэхнічнай дапамогі падаецца яе атрымальнікам у Міністэрства эканомікі.

Такім чынам, ухваленьне праектаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі зьдзяйсьняецца па наступнай схеме:

(табліца 1)

РЭГІСТРАЦЫЯ ПРАЕКТАЎ (ПРАГРАМАЎ) МІЖНАРОДНАЙ ТЭХНІЧНАЙ ДАПАМОГІ

Для рэгістрацыі праектаў (праграмаў) міжнароднай тэхнічнай дапамогі яе атрымальнік павінен зьвярнуцца ў Міністэрства эканомікі з заявай аб іх рэгістрацыі. Да заявы аб рэгістрацыі далучаецца арыгінал альбо засьведчаная ва ўстаноўленым парадку копія праекту (праграмы).

У выпадку, калі праект (праграма) не прадугледжвае ўхваленьня Ўрадам Беларусі і падрыхтаваны на падставе міжнароднай дамовы Рэспублікі Беларусь, якой устаноўленыя іншыя правілы, а ня тыя, што зьмяшчаюцца ў заканадаўстве Беларусі, да зая-

4 Атрымальнік міжнароднай тэхнічнай дапамогі - Рэспубліка Беларусь альбо яе адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў асобе ўпаўнаважаных дзяржаўных органаў, юрыдычных асобаў і грамадзянаў Рэспублікі Беларусь, якія рэалізуюць праекты (праграмы) міжнароднай тэхнічнай дапамогі альбо на карысьць якіх яны рэалізуюцца.

5. Пералік рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіраваньня і іншых дзяржаўных арганізацыяў, падначаленых ураду, якія зьяўляюцца галаўнымі ў пытаньнях супрацоўніцтва з міжнароднымі арганізацыямі, і сьпіс міжнародных арганізацыяў зацьверджаны Пастановай Савета Міністраў Беларусі ад 30.11.2002 г. № 1504 “Аб супрацоўніцтве Рэспублікі Беларусь з міжнароднымі арганізацыямі”.

вы далучаецца пацьвярджэньне Міністэрства замежных справаў Рэспублікі Беларусь пра дзеяньне нормаў міжнародных дамоваў.

У выпадку неабходнасьці Міністэрства эканомікі Беларусі можа запытаць і атрымаць у пісьмовым выглядзе ад атрымальніка дадатковую інфармацыю і дакумэнтацыю, зьвязаную з зацьвярджэньнем альбо ўхваленьнем праекту (праграмы), яго суфінансаваньнем, а таксама засьведчаныя атрымальнікам копіі статуту і пасьведчаньня аб дзяржаўнай рэгістрацыі атрымальніка.

Калі арыгінал праекту (праграмы) складзены на замежнай мове, даецца яго пераклад, засьведчаны подпісам і пячаткай атрымальніка.

Міністэрства эканомікі разглядае пададзеныя дакумэнты на працягу пяці дзён з дня іх паступленьня. Пры неабходнасьці перадачы атрымальнікам дадатковай інфармацыі і дакумэнтацыі ў Міністэрства эканомікі тэрмін разгляду заявы працягваецца.

Праекты (праграмы) рэгіструюцца на тэрмін іх рэалізацыі. У выпадку адсутнасьці ў праекце (праграме) тэрмінаў рэалізацыі за аснову бярэцца тэрмін, указаны ў заяве атрымальніка. Пры гэтым на першым аркушы праекту (праграмы) Міністэрствам эканомікі пазначаецца тэрмін рэалізацыі праекту (праграмы). Пасьля рэгістрацыі праекту атрымальніку выдаецца арыгінал альбо засьведчаная ва ўстаноўленым парадку копія праекту (праграмы) з пастаноўкай на першым аркушы штампу з пазначэньнем даты і нумару рэгістрацыі, а таксама на кожным аркушы праекту (праграмы) штампу Ўпраўленьня па супрацы зь міжнароднымі арганізацыямі і каардынацыі тэхнічнай дапамогі Дэпартамэнту зьнешнеэканамічных сувязяў Міністэрства эканомікі Беларусі.

У выпадку ўнясеньня зьменаў альбо дапаўненьняў у праект (праграму) у сувязі са зьменамі ці дапаўненьнямі сьпісу атрымальнікаў, фінансаваньня, мэтаў, задачаў і мерапрыемстваў праекту (праграмы) атрымальнік у дзесяцідзённы тэрмін з моманту афіцыйнага афармленьня зьменаў альбо дапаўненьняў праекту (праграмы) зьвяртаецца ў Міністэрства эканомікі з заявай аб яго рэгістрацыі.

Такім чынам, рэгістрацыя праектаў (праграмаў) міжнароднай тэхнічнай дапамогі зьдзяйсьняецца па наступнай схеме:

табліца 2



РАЗГЛЯД І ЎХВАЛЕНЬНЕ ПЕРАЛІКАЎ ТАВАРАЎ (МАЁМАСЬЦІ, У ТЫМ ЛІКУ ГРАШОВЫХ СРОДКАЎ), РАБОТ І ПАСЛУГАЎ, ЯКІЯ ДАЮЦЦА ДЛЯ РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАЕКТАЎ (ПРАГРАМАЎ) МІЖНАРОДНАЙ ТЭХНІЧНАЙ ДАПАМОГІ

Ухваленьне пералікаў тавараў (маёмасьці, у тым ліку грашовых сродкаў), што вызваляюцца ад падаткаабкладаньня, работ і паслугаў, якія даюцца для рэалізацыі праектаў (праграмаў) міжнароднай тэхнічнай дапамогі, ажыцьцяўляецца Камісіяй па міжнароднай тэхнічнай супрацы пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Падставай для прыняцьця да разгляду і ўхваленьня Камісіяй пералікаў тавараў (маёмасьці, у тым ліку грашовых сродкаў), работ і паслугаў, якія даюцца для рэалізацыі праектаў (праграмаў) міжнароднай тэхнічнай дапамогі, зьяўляецца афіцыйны зварот атрымальнікаў тэхнічнай дапамогі ў Міністэрства эканомікі. Пад такім зваротам разумеецца заява, складзеная ў адвольнай форме. Да заявы далучаюцца наступныя дакумэнты:

- чатыры асобнікі пераліку, які павінен зьмяшчаць найменьне тавару (маёмасьці, у тым ліку грашовых сродкаў), работ і паслугаў (у тым ліку адзінку вымярэньня, колькасьць, вартасьць), а таксама найменьне атрымальнікаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі. Пералік засьведчваецца подпісам і пячаткай атрымальніка тэхнічнай дапамогі;
- копія дакумэнту аб наданьні атрымальніку міжнароднай тэхнічнай дапамогі ўліковага нумару падаткаплацельшчыка;
- пры наяўнасьці на дадзеным этапе дакумэнтаў, якія пацьвярджаюць пастаўку тавараў (маёмасьці, у тым ліку грашовых сродкаў), работ і паслугаў, - арыгінал і копія акту перадачы, дамовы (кантракту) на атрыманьне грашовых сродкаў, у тым ліку ў замежнай валюце, тавараў (маёмасьці), выкананьне работ, аказаньне паслугаў у рамках праекту (праграмы) міжнароднай тэхнічнай дапамогі. Акт перадачы, дамова (кантракт) павінны зьмяшчаць спасылку на зарэгістраваны праект (праграму) міжнароднай тэхнічнай дапамогі.

Копіі дакумэнтаў засьведчваюцца подпісам і пячаткай некамэрцыйнай арганізацыі - атрымальніка міжнароднай тэхнічнай дапамогі. У выпадку калі атрымальнікам зьяўляецца грамадзянін Рэспублікі Беларусь - подпісам, засьведчаным у натарыяльным парадку.

Экспэртыза адпаведнасьці пераліку мэтам і задачам праекту (праграмы) міжнароднай тэхнічнай дапамогі зьдзяйсьняецца не пазьней як у 10-дзённы тэрмін ад дня паступленьня дакумэнтаў у Міністэрства эканомікі[6]. На падставе праведзенай экспэртызы падрыхтоўваецца экспэртнае заключэньне. Пры наяўнасьці прынцыповых неадпаведнасьцяў прызначэньня тавараў (маёмасьці, у тым ліку грашовых сродкаў), работ і паслугаў, уключаных у пералік, мэтам і задачам праекту (праграмы) міжнароднай тэхнічнай дапамогі Міністэрства эканомікі мае права запытваць у атрымальнікаў тэхнічнай дапамогі дадатковыя абгрунтаваньні адпаведнасьці пералікаў мэтам і задачам гэтага праекту (праграмы) з працягненьнем тэрмінаў падрыхтоўкі экспэртнага заключэньня да перадачы такіх да-

6 Экспэртыза зьдзяйсьняецца рабочай групай, што ўключае спэцыялістаў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіраваньня, прадстаўнікі якіх уваходзяць у склад Камісіі, а таксама прадстаўніка Нацыянальнага каардынацыйнага бюро Праграмы TACIS у Рэспубліцы Беларусь. Пры неабходнасьці могуць таксама прыцягвацца спэцыялісты іншых органаў дзяржаўнага кіраваньня.

кумэнтаў у Міністэрства альбо ўносіць прапанову ў Камісію аб адмове ва ўхваленьні пераліку.

Міністэрства эканомікі выдае атрымальніку міжнароднай тэхнічнай дапамогі выпіску з рашэньня Камісіі і адзін асобнік пераліку, якія захоўваюцца ў атрымальніка тэхнічнай дапамогі.

Рашэньне Камісіі аб ухваленьні пераліку і адзін асобнік пераліку Міністэрства эканомікі перадае ў Міністэрства па падатках і зборах і ў Дзяржаўны мытны камітэт.

Такім чынам, ухваленьне пераліку тавараў (маёмасьці, у тым ліку грашовых сродкаў), работ і паслугаў, якія даюцца для рэалізацыі праектаў (праграмаў) міжнароднай тэхнічнай дапамогі, зьдзяйсьняецца па наступнай схеме:
(табліца 3)

табліца 3

ТЭРМІНЫ РАЗГЛЯДУ І АДМОВА ВА ЎХВАЛЕНЬНІ ПРАЕКТУ (ПРАГРАМЫ) МІЖНАРОДНАЙ ТЭХНІЧНАЙ ДАПАМОГІ, А ТАКСАМА ПЕРАЛІКУ ТАВАРАЎ (МАЁМАСЬЦІ, У ТЫМ ЛІКУ ГРАШОВЫХ СРОДКАЎ), РАБОТ І ПАСЛУГАЎ, ЯКІЯ ДАЮЦЦА ДЛЯ РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАЕКТАЎ (ПРАГРАМАЎ) МІЖНАРОДНАЙ ТЭХНІЧНАЙ ДАПАМОГІ

Тэрмін ухваленьня праекту (праграмы) міжнароднай тэхнічнай дапамогі не павінен перавышаць 30 дзён ад даты правядзеньня пасяджэньня Камісіі. Пасяджэньні Камісіі праводзяцца па меры неабходнасьці, але не радзей аднаго разу на месяц.

Адмова ва ўхваленьні праекту (праграмы) міжнароднай тэхнічнай дапамогі мусіць быць матываваная і перададзеная Міністэрствам эканомікі атрымальніку тэхнічнай дапамогі ў пісьмовай форме ў тыднёвы тэрмін ад дня прыняцьця такога рашэньня Камісіяй. Ва ўхваленьні праекту (праграмы) міжнароднай тэхнічнай дапамогі можа быць адмоўлена ў выпадках:

- калі праект (праграма) міжнароднай тэхнічнай дапамогі не адпавядае нацыянальным інтарэсам Рэспублікі Беларусь;
- немагчымасьці пацьвярджэньня абавязацельстваў па выдаткаваньні нацыянальнага суфінансаваньня для праекту (праграмы) міжнароднай тэхнічнай дапамогі;
- наяўнасьці ў праекце (праграме) міжнароднай тэхнічнай дапамогі палажэньняў, абавязацельстваў, якія супярэчаць заканадаўству Рэспублікі Беларусь, не адпавядаюць адно аднаму ці ўзаемавыключаюцца.

Ва ўхваленьні пераліку пры падачы дакумэнтаў у поўным аб'ёме можа быць адмоўлена ў выпадках:

- няправільнага афармленьня пераліку альбо наяўнасьці ў ім няпэўных зьвестак;
- адсутнасьці рэгістрацыі праекту (праграмы) міжнароднай тэхнічнай дапамогі;
- наяўнасьці ў дамове (кантракце) палажэньняў, абавязацельстваў, якія не адпавядаюць адно аднаму ці ўзаемавыключаюцца;
- непрадастаўленьня ва ўстаноўленыя заканадаўствам тэрміны справаздачаў аб рэалізацыі праектаў (праграмаў) міжнароднай тэхнічнай дапамогі;
- калі акт перадачы, дамова (кантракт) не зьмяшчае спасылкі на праект (праграму) міжнароднай тэхнічнай дапамогі.

ПАДАЧА СПРАВАЗДАЧАЎ АБ РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАЕКТАЎ (ПРАГРАМАЎ) МІЖНАРОДНАЙ ТЭХНІЧНАЙ ДАПАМОГІ

Для арганізацыі сыстэмы кантролю выкарыстаньня міжнароднай тэхнічнай дапамогі атрымальнікі перадаюць у Міністэрства эканомікі Беларусі паўгадавыя справаздачы аб ходзе рэалізацыі праектаў (праграмаў) па ўстаноўленай форме. Справаздача перадаецца не пазьней за 15 ліпеня і 15 студзеня.

Пасьля завяршэньня праекту (праграмы) атрымальнікі не пазьней за месяц з даты заканчэньня праекту перадаюць завяршальную справаздачу ў Міністэрства эканомікі Беларусі ва ўстаноўленай форме.

Пры неаднаразовым парушэньні тэрмінаў падачы ў Міністэрства эканомікі Беларусі справаздачаў па рэалізацыі праектаў (праграмаў), а таксама пры ўстанаўленьні ўпаўнаважанымі дзяржаўнымі органамі нямэтавага выкарыстаньня міжнароднай тэхнічнай дапамогі і паступленьні адпаведнага дакумэнту ў Міністэрства эканомікі Беларусі, апошняе (з улікам запатрабаванай у атрымальніка інфармацыі) накіроўвае Камітэту дзяржаўнага кантролю Беларусі вышэйпазначаную інфармацыю, а таксама ўносіць на разгляд Камісіі прапанову аб прызнаньні рэгістрацыі праекту (праграмы) несапраўднай. Пры прыняцьці Камісіяй згаданага рашэньня Міністэрства эканомікі ў пяцідзённы тэрмін накіроўвае выпіску з пратаколу пасяджэньня Камісіі Камітэту дзяржаўнага кантролю Дзяржаўнаму мытнаму камітэту Беларусі і атрымальніку.

{ УДАКЛАДНЕНЬНЕ }

У № 3 (7) за травень 2004 г. у матэрыяле "Некаторыя асаблівасьці розных арганізацыйна-прававых формаў некамэрцыйных арганізацыяў" па віне рэдакцыі была дапушчаная памылка. На стар. 28 замест "Правы замежных грамадзянаў на стварэньне арганізацыі і ўступленьне ў яе" трэба чытаць: "Правы замежных грамадзянаў на стварэньне (уступленьне) у арганізацыю". Прыносім прабачэньні чытачам і аўтару.

Складана пра важнае

Грамадзянская адукацыя дарослых: ацэнка эфэктыўнасьці праграм / Т. Пашэвалава, С. Гаўдзіс, Д. Карпіевіч і інш.; Пад агул. рэд. Д. Карпіевіча, С. Гаўдзіс. - Менск: СТАА "Медысонт", 2004. Выданьне падрыхтавана Адукацыйным цэнтрам "Пост" і "Цэнтрам сацыяльных інавацыяў".

Акуратна зробленая кніжка ў сіняй "эўрапейскай" вокладцы прыцягнула ўвагу сваёй тэматыкай. Ацэнка эфэктыўнасьці дзейнасьці НДА - сапраўды сур'ёзная праблема ў нашым трэцім сэктары. І ня толькі ў адукацыйным кірунку. Вельмі часта імпэту грамадзкай арганізацыі хапае толькі на тое, каб выканаць непасрэдна "праектныя дзеяньні". Але пытаньне, як паўплывалі гэтыя дзеяньні на мэтавую групу, на ўдзельнікаў, у якой ступені былі дасягнутыя мэты праекту, што не атрымалася і чаму, - застаецца, у найлепшым выпадку, на апошнім месцы. Не хапае "культуры" грамадзкай дзейнасьці. А каб гэта паправіць, зразумела, і патрэбныя веды.

Зборнік артыкулаў падрыхтаваны Тацянай Пашэвалавай, Сьвятланай Гаўдзіс, Дзьмітрыем Карпіевічам ды іншымі беларускімі і нават нямецкімі спэцыялістамі пры падтрымцы TACIS. ***"У ім адлюстраваны розныя пункты гледжаньня і падыходы да ацэнкі, а таксама прапанаваныя некаторыя практычныя інструмэнты для ацэнкі праектаў у сфэры грамадзянскай адукацыі, якія праводзяцца грамадзкімі аб'яднаньнямі…", -*** **дэкляруе анатацыя ў самой кніжцы.**

Прагляд зьместу ўпэўнівае ў грунтоўнасьці падыходу аўтараў зборніку: *"Ацэнка адукацыйных праграмаў. Асноўныя паняцьці і мадэлі", "Ацэнка эфэктыўнасьці адукацыйнага сэмінару", "Інавацыйныя формы і мэтады навучаньня з выкарыстаньнем мадэлі Кіркпатрыка"* і г. д. Большасьць артыкулаў насамрэч вызначаюцца навуковым падыходам і сур'ёзным валоданьнем тэмай. Можна асабліва адзначыць сваёй грунтоўнасьцю тэкст Т. Пашэвалавай па ацэнцы адукацыйных праграмаў. Такім чынам, застаецца толькі павіншаваць аўтараў з тым, што "тэорыя трэцяга сэктару" ў нашай краіне пачынае выходзіць на нармальны навуковы ўзровень.

Але... (на маю думку, у рэцэнзіі заўсёды павінна быць нейкае "але", якое не дае заснуць аўтару на сваім Алімпе). Пасьля знаёмства з кніжкай у мяне зьявіўся шэраг пытаньняў: "А для каго ж яна створаная? Якая мэта (і, адпаведна, вынік і ўплыў на грамадзтва) гэтай грунтоўнай анталёгіі?" І тут мушу адзначыць, што форма і мова кандыдацкай дысэртацыі арыентуюць працу на невялікае кола тых, хто больш займаецца менавіта тэорыяй грамадзкай працы, чым гэтай дзейнасьцю на практыцы. Гэта, вядома, не зьмяншае вартасьцяў зборніку, але ці шмат людзей у нас вывучаюць гэтую самую тэорыю, так бы мовіць, акадэмічна? Можа, трэнэрам і актывістам грамадзкіх арганізацыяў варта было б прапанаваць практычны дапаможнік на гэтую ж тэму? З гэтага пункту гледжаньня найбольш цікавымі артыкуламі ў кнізе мне падаюцца тэксты Вольгі Саўчык, Дар'і Азаркі, Дзьмітрыя Карпіевіча, прысьвечаныя канкрэтным формам сэмінараў. Хаця для практычнага выкарыстаньня і яны падаюцца шматслоўнымі і перагружанымі рознымі дадаткамі.



Так, ацэньваючы эфэктыўнасьць зборніку "Грамадзянская адукацыя для дарослых", магу сказаць: "Узровень зборніку дастаткова высокі, а эфэктыўнасьць... хіба - "сяк-так".

Парада аўтарам і складальнікам: каб павысіць эфэктыўнасьць праекту "Навучаемся грамадзянскасьці", у рамках якога зробленая кніжка, пажадана падрыхтаваць практычны дапаможнік "Ацэнка эфэктыўнасьці праграмаў для актывістаў грамадзянскай адукацыі". З задавальненьнем вазьмуся за яе рэцэнзаваньне.

Людвік Бэра

{ ІНФАРМАТАР }

Сэмінар у Швэцыі

Праграма "Моладзь" і Швэцкі Нацыянальны Фонд Спадчыны - Моладзевае супрацоўніцтва з Усходняй Эўропай арганізуюць сэмінар па ўстанаўленьні кантактаў, які пройдзе з 12 да 17 кастрычніка 2004 году ў Швэцыі.

Мэта сэмінару - устанаўленьне кантактаў і напісаньне праектаў, якія могуць быць пададзены на праграму "Моладзь". Ад Беларусі будуць адабраныя 4 удзельнікі. Больш падрабязную інфармацыю пра сэмінар, а таксама форму заяўкі можна атрымаць праз электронную пошту альбо ў офісе БСМДГА "Рада": г. Менск, вул. Варвашэні, 77-231, тэл./факс 2348343; rada@rada.by

Апошні тэрмін падачы зяаўкі - 20 жніўня.